Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

12 ЖНІЎНЯ 2008 г.
АЎТОРАК
№ 149
(26262)

Кошт 450 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

Увага! «Прамая лінія»

Пенсійная тэма. Якія праблемы?

Асаблівасці вызначэння стажу, разлік індывідуальнага каэфіцыента, датэрміновы выхад на пенсію, змяненні ў заканадаўстве — аб гэтым і іншым мы прапануем пагутарыць падчас «прамой лініі» з удзелам **начальніка галоўнага ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Валянціны Вікенцьеўны КАРАЛЁВАЙ.**

Такім чынам, згодна з папярэдняй дамоўленасцю, наша «прамая лінія» пройдзе **19 жніўня з 11 да 12 гадзін** па рэдакцыйных тэлефонах: (8 017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна задаваць па нумары 287 17 57.

Беларусь гатова нарошчваць супрацоўніцтва з Кітаем

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 9 жніўня ў рамках рабочага візіту ў КНР адказаў на пытанні прадстаўнікоў беларускіх і кітайскіх СМІ.

Журналісты цікавіліся ацэнкай кіраўніка дзяржавы станам двухбаковых адносінаў, рэформ, што праводзяцца ў Кітаі, меркаваннямі адносна націску, які аказваецца на Кітай асобнымі знешнепалітычнымі сіламі, а таксама ўражаннямі ад цырымоніі адкрыцця Алімпійскіх гульняў.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што быў вельмі ўражаны арганізацыяй Алімпіяды. «Мяне не пакідала думка аб тым, што кітайцы перамаглі ўжо. Таму што перасягнуць тое, што яны зрабілі да Алімпіяды, і тое, што паказалі на адкрыцці Гульняў, наўрад ці па сілах нейкай дзяржаве. Таму ў іх ужо вялікая перамога ў актыве. Думаю, што нам у іх трэба вучыцца ўсяму: і дзяржавай кіраваць, і фільмы здымаць, і алімпіяды рыхтаваць. Адчуваю, што пасля Алімпіяды мы і ў спорце будзем чаму-небудзь у іх вучыцца», — сказаў Прэзідэнт.

Пакуль жа Беларусь гатова вучыць кітайскіх сяброў па іх просьбе гульні ў хакей. Беларускія трэнеры правялі майстар-клас для кітайскіх хлопцаў. «Нашы хакеісты тут працуюць ужо тры дні, завязаліся добрыя кантакты. Кітайскі бок гатовы фінансаваць паездкі беларускіх хакеістаў, а таксама прыязджаць да нас. Упэўнены, калі кітайцы пачнуць гуляць у хакей, то на працягу пяцігодкі яны выйдуць на наш узровень, а то і вышэйшы», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы асабліва падкрэсліў: кітайцы — вельмі працавіты народ, і гэтаму ў іх таксама варта павучыцца. «Яны выкарыстоўваюць кожны свабодны кавалачак зямлі. Калі б мы напалавіну працавалі так, як кітайскі народ, мы былі б самай квітнеючай нацыяй. Уражанняў у мяне вельмі шмат. Тое, як яны будуюць, — гэта проста ўражвае! Не будзе ў нас жорсткай дысцыпліны, канкрэтных тэрмінаў і патрабаванняў па якасці (дапусцім, да будаўнікоў), будзем «боўтацца» на месцы. А кітайцы за 5 гадоў літаральна «перавярнулі» ўвесь Пекін. Пекін прадэманстраваў, якой павінна быць краіна», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на той факт, што Кітай сёння таксама, як і Беларусь, вырашае праблемы аграпрамысловага сектара. «Яны заняліся сельскай гаспадаркай, каб пазбегнуць дыспрапорцыі ў развіцці грамадства, рэзкага дзялення на багатых і бедных, і я ўпэўнены: яны гэту праблему вырашаць. У Кітая праблем не будзе», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

«Калі некаторыя кіраўнікі дзяржаў (у час адкрыцця Алімпіяды) убачылі, што робіць Кітай, у іх сталі кіслыя твары, яны не вытрымалі і не выседзелі да канца цырымоніі — проста пайшлі», — адзначыў Прэзідэнт.

Ён падкрэсліў, што ў свой час тавараабарот паміж Беларуссю і Кітаем складаў амаль $100 млн, і кіраўніцтва абедзвюх краін намячала дасягнуць аб'ёму двухбаковага гандлю $500 млн. Сёння ўзаемны тавараабарот набліжаецца да $2 млрд.

«Мы ідзём, можна сказаць, гіганцкімі крокамі ў тавараабароце. Па аб'ёму ён, магчыма, і невялікі, але тэмпы росту вельмі добрыя. Гаворачы аб перспектывах, скажу шчыра: калі б кітайцы хутчэй прымалі рашэнні, паверце, у Кітая сапраўды ў Еўропе была б краіна, у якой кітайцы маглі б спакойна працаваць на ўвесь рэгіён, і на Украіну, і на Расію ў тым ліку. Па некаторых праектах пакуль вельмі марудна разгортваемся, але ж раней і гэтага не мелі», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Пры гэтым Прэзідэнт заўважыў, што Беларусь і Кітай сёння мысляць у двухбаковых адносінах «ужо іншымі катэгорыямі, больш глабальнымі». «І вельмі хацелася б, каб Кітай узмацніў тэмпы ў гэтых адносінах. Я аб гэтым сказаў Старшыні КНР Ху Цзіньтао. Ён гэта ўспрыняў з разуменнем», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

(Заканчэнне на 2-й стар.)

Спачатку дыплом, потым — праца?

Рызыка застацца без працоўнага месца напрамую залежыць ад узроўню адукацыі. У прыватнасці, як паведаміла карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Галіна Трафіменка, зараз на ўліку ў службах занятасці краіны знаходзяцца толькі 3798 чалавек з дыпломамі ВНУ — гэта менш за 9 працэнтаў ад агульнай колькасці беспрацоўных. Адначасова 5291 беспрацоўны (12,5 працэнта) мае агульную базавую, 6837 чалавек (16 працэнтаў) — сярэднюю спецыяльную, а 9420 беспрацоўных (22 працэнты) — прафесійна-тэхнічную адукацыю. Найбольшую ж колькасць беспрацоўных (17316 чалавек, або 40,5 працэнта) складаюць грамадзяне краіны, якія валодаюць толькі атэстатамі аб заканчэнні сярэдняй школы.

Сяргей ГРЫБ.

Мабільнікі ў... газавым балоне

Спробу нелегальнага правозу партыі мабільных тэлефонаў і аксэсуараў да іх спынілі супрацоўнікі пагранічнага пункта мытнага афармлення «Брузгі-2».

Грамадзянін Польшчы накіроўваўся ў Беларусь, выбраўшы спрошчаную форму дэкларавання. Аднак пасля перасячэння «зялёнага калідора» супрацоўнікі мытнікі, агледзеўшы салон і багажнае аддзяленне мікрааўтобуса «Фольксваген Транспарцёр», выявілі 54 мабільныя тэлефоны, 115 зарадных і 74 прылады «свабодныя рукі» да «мабільнікаў» на агульную суму больш за 58 мільёнаў рублёў. Увесь тавар вытворчасці фірмы «NOKIA» знаходзіўся ў спецыяльна вырабленым тайніку, які быў абсталяваны ў аўтамабільным газавым балоне.

Затрыманы не толькі тэлефонныя апараты і аксесуары да іх, але і мікрааўтобус як сродак для нелегальнага перамяшчэння тавару праз мытную мяжу Беларусі.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Ліпкія да халявы

У першым выпадку інспектар мытнай службы 1963 года нараджэння каля Цэнтральнага рынку Гомеля атрымаў 400 тысяч рублёў ад індывідуальнага прадпрымальніка, якому ён рабіў «зялёную вуліцу» за незаконны ўвоз тавараў. Хабарнік быў арыштаваны супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з карупцыяй і эканамічнымі злачынствамі. Як устаноўлена, раней у кішэні дзялка аказаліся і 700 тысяч рублёў, якія ён патрабаваў ад таго ж самага прадпрымальніка.

Ліпкія да халявы рукі меў і начальнік аднаго з аддзелаў упраўлення па рабоце з насельніцтвам адміністрацыі Чыгуначнага раёна Гомеля. Яго затрымалі ў службовым кабінеце якраз у той момант, калі яго кашалёк папоўніўся 750 тысячамі рублёў, якія ён патрабаваў у двух электраманцёраў упраўлення за прадастаўленне ім работ па мантажы пажарнай сігналізацыі. Гэты начальнік сам жа прымаў выкананыя работы і атрымліваў ад тых жа хлопцаў дзесяць працэнтаў ад іхніх прэмій.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Пайшла бабуля па грыбы...

яшчэ пятага жніўня, і дадому не вярнулася. У пошукі яе, жыхаркі пасёлка Капцэвічы Петрыкаўскага раёна 1930 года нараджэння, уключыліся 16 работнікаў міліцыі, два — лясгаса, адзін — МНС і дзесяць вясковцаў. Былі абследаваны вялікія лясныя плошчы. Пакуль — безвынікова.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.



Настасся НОВІКАВА:

ПЕКІНСКІ ПАЧЫН

150 грамаў, якія змянілі серабро на бронзу

(Чытайце 3-ю стар.)

Анатоль БУЯЛЬСКІ, галоўны трэнер жаночай зборнай Беларусі па баскетболе:

МЕДАЛЬНЫ ЗАЛІК

Краіна	Золата	Серабро	Бронза	Усяго
Кітай	9	3	2	14
Паўднёвая Карэя	4	4	0	8
ЗША	3	4	5	12
Італія	3	3	2	8
Аўстралія	2	0	3	5
Японія	2	0	2	4
Вялікабрытанія	2	0	1	3
Чэхія	2	0	0	2
Нідэрланды	1	1	1	3
Іспанія	1	0	1	2
Фінляндыя	1	0	1	2
Азербайджан	1	0	0	1
Індыя	1	0	0	1
Румынія	1	0	0	1
Тайланд	1	0	0	1
Расія	0	4	2	6
Францыя	0	3	2	5
Паўночная Карэя	0	1	3	4
Германія	0	1	1	2
Куба	0	1	1	2
Аўстрыя	0	1	0	1
Венгрыя	0	1	0	1
В'етнам	0	1	0	1
Зімбабвэ	0	1	0	1
Калумбія	0	1	0	1
Нарвегія	0	1	0	1
Славакія	0	1	0	1
Турцыя	0	1	0	1
Швецыя	0	1	0	1
Бразілія	0	0	2	2
Інданезія	0	0	2	2
Беларусь	**0**	**0**	**1**	**1**
Алжыр	0	0	1	1
Грузія	0	0	1	1
Таджыкістан	0	0	1	1
Тайвань	0	0	1	1
Узбекістан	0	0	1	1
Харватыя	0	0	1	1
Швейцарыя	0	0	1	1

Па стану на 18. 00 11 жніўня.

«ГУЛЬНЯ З ВЯЛІКІМ АДРЫВАМ МЯНЕ ЗАЎСЁДЫ ПУГАЕ»

У групе «А» беларусы згулялі ўжо другую сустрэчу. Калі паядынак з дзеючымі чэмпіёнкамі свету, аўстралійкамі, унёс невялікую долю аптымізму — мы хоць і уступілі 64:83, але ж зразумелі: нават з самым моцным сапернікам можна гуляць на роўных, то ўчарашні матч з камандай Латвіі пацвердзіў нашу моц. Розніца ў +22 мячы (79:57) — гэта не што іншае, як паказчык узроўню айчыннага жаночага баскетбола ды трэнерскага таленту і мудрасці.

Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з галоўным трэнерам беларускай каманды адразу пасля пераможнага матчу.

— Анатоль Сяргеевіч, прыміце віншаванні з цудоўнай гульнёй і выдатным вынікам.

— Дзякуй, толькі мне не хацелася б зараз хваліць сябе, хоць вельмі прыемна на душы ад такой перамогі.

— На ваш погляд, ці роўна правяла каманда Беларусі кожны з чатырох адрэзкаў матчу?

— Думаю, што так.

— У другой палове матчу быў момант, калі разрыў з плюс 19 скараціўся да плюс 8. Здавалася, што яшчэ б крыху — і...

— Ведаеце, мяне заўсёды гульня з вялікім адрывам пугае. Зрэшты, такія скачкі з плюса на мінус з камандай Латвіі ў нас здараліся. Тым не менш вельмі не хацелася, каб такія моманты ў гульні ўзнікалі. Дзякуй богу, што псіхалагічна наша каманда моцная і дзяўчаты за адносна кароткі адрэзак часу змаглі выправіць сітуацыю.

— Маглі б правесці аналогію паміж папярэднім матчам з камандай Аўстраліі і цяперашнім з латышкамі?

— Шчыра кажучы, што параўноўваць гэтыя паядынкі цяжка, бо аўстралійкі з'яўляюцца чэмпіёнкамі планеты, і гэтым ўсё сказана. Тым не менш адзначу, што і з імі можна паспяхова гуляць. Каманда Латвіі, безумоўна, ніжэйшая класам, чым чэмпіёнкі свету, але ж гэта не значыць, што іх можна было закідаць шапкамі. Такога настрою ў нашых ігракоў не было і не магло быць, бо ў камандзе гуляюць прафесіяналы. Мне здаецца, што зарукай паспяховай гульні стала тое, што мы паспелі адаптавацца да пляцоўкі, адчуць мяч, намацаць гульнявы рытм і рэалізаваць гэтыя моманты на сваю карысць.

— Перамога над Латвіяй — гэта пропуск у 1/8 фіналу?

— Давайце не будзем спяшацца. Усё ж у фінальнай частцы алімпійскіх Гульняў сабраліся тыя каманды, якія могуць паказаць сябе ва ўсёй красе ў любы момант. Паглядзіце, які ўпарты матч правялі нашы суседзі на турніры — каманды Расіі і Карэі (77:72), Карэі і Бразіліі (68:62), Расіі і Латвіі (62:57). Так што для таго, каб трапіць у наступны этап спаборніцтваў, магчыма, дадзвацца лічыць і забітыя-прапушчаныя мячы. Таму мы стараліся ў другім матчы захаваць як мага большы адрыў, і ў нас гэта атрымалася.

— На ваш погляд, якія рычагі ёсць для ўзмацнення гульні вашых падначаленых: большая ўвага фізпадрыхтоўцы ці, можа, правядзенне нейкіх індывідуальных ці калектыўнай гутарак?

— Паўтаруся, што ў камандзе іграюць прафесіяналы, якім слоўная накачка дакладна не трэба, хоць сказаць некалькі добрых слоў для падтрымкі маральнага духу ці камплімент можна. У нас ёсць план падрыхтоўкі да кожнай гульні. У любым выпадку кожную сустрэчу мы будзем праводзіць як вырашальную і прыкладаць усе сілы для яе дастойнага правядзення.

Уладзімір ЗДАНОВІЧ.

г. Пекін.

З серады пачне прыпякаць да плюс 33

На гэтым тыдні чакаецца даволі цёплае і нават спякотнае надвор'е, якое прыняце да нас гарачае паветра з боку поўдня Еўропы, паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.

У аўторак і сераду ападкаў не прадбачыцца, толькі ў асобных раёнах Гродзенскай і Віцебскай абласцей магчымы кароткачасовыя дажджы. Тэмпература паветра ў аўторак удзень 22—27, па захадзе да плюс 29 градусаў. Тэмпература ўначы ў сераду 15—20, удзень 26—32 градусы. З чацвярга на тэрыторыю Беларусі пачне рухацца вільготнае паветра з боку Заходняй Еўропы. Тады на працягу двух дзён месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Тэмпература паветра ў чацвер уначы 15—20, удзень 23—29, па ўсходзе да 30—33 градусаў. У пятніцу ўначы чакаецца ўжо 13—19, удзень 21—26, па паўднёвым усходзе да 27—32 градусаў.

У выхадныя атмасферны фронт з боку Заходняй Еўропы прынясе да нас няўстойлівае надвор'е. Так, у суботу ў заходніх і цэнтральных раёнах, а ў нядзелю месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы з навальніцамі. Тэмпература паветра ў суботу ўначы 15—21, удзень 20—27, па ўсходзе да 28—33 градусаў. А вось у нядзелю ў краіну завітае больш свежае паветра са Скандынавіі. Тэмпература ўначы стане 11—18, удзень 18—25, па ўсходзе — да 27 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

«Песні пад мірным небам»

Гастрольны тур заслужанай артысткі Беларусі Ірыны Дарафеевай закончыўся ў мінулыя выхадныя ў самым заходнім рэгіёне краіны.

Зорка беларускай эстрады ахвотна выступае не толькі ў вялікіх гарадах, але і ў самых далёкіх вёсках. І ўзнагародай за гэта мае бурныя апладысменты і шчырую любоў людзей з глыбінкі. Вось і сёлета, у гарачую пару ўборкі, Ірына падарыла працаўнікам гадзіну свята. Свае гастролі яна пачала са знакамітага СВК «Астрамечава». Затым быў канцэрт «на ўра» ў Брэсце.

Добрую беларускую песню паслухалі ў Драгічыне, Іванцэвічах, Ляхавічах і, вядома, у вёсках гэтых раёнаў. А ў Іванаве канцэрт прайшоў на галоўнай плошчы горада пасля сустрэчаў на мотакросе. Абсалютная большасць гледачоў — моладзь, канцэрт атрымаўся вясёлым, «завадным», прайшоў на адным дыханні.

Напярэдадні выхадных любімую спявачку сустракалі ў Баранавічах і Пінску, а перад гэтым, як заўсёды, прайшлі канцэрты ў аграгарадку «Жамчужны» і вёсцы Валішча. А 9—10 жніўня заслужаная артыстка дарыла свой талент гледачам Лунінеччыны. Доўга не адпускалі са сцэны Ірыну Дарафееву ў Дварцы і Мікашэвічах. Такім жа паспяховым быў канцэрт і ў Лунінцы...

Яна СВЕТАВА.

Ураджайнасць — 50!

У Бешанковіцкім раёне ў прыватнай сельскагаспадарчай унітарнай гаспадарцы «ААБ Наватар» ураджайнасць збожжавых пад 50 цэнтнераў з гектара. Агульная тут уборачная плошча зерневых — 2000 гектараў. Для параўнання: у сярэднім па Віцебскай вобласці ўраджайнасць — 34 ц/га. У свірнавай вазе ў «Наватары» на сёлетнім жніве плануюць закласці 10 тысяч тон. А летась — толькі 7 тысяч.

Камбайнер Мікалай Савіла — адзін з лепшых у гаспадарцы. На момант нашай сустрэчы першым намалаціў 500 тон. Дапамагае яму Эдуард Каспяровіч.

— Добры сёлета ўраджай! Праўда, пачалі жніво крыху са спазненнем у параўнанні з мінулым годам. Надвор'е ўнесла свае карэктывы, — непакоіцца камбайнер.

Кіраўнік «Наватара» Вячаслаў Долгі не без гонару паказваў і расказваў мне пра новую сушылку, што ў вёсцы Ржаўка.

— Яна сумесная беларуска-польская вытворчасці. Толькі нядаўна паехалі ад нас польскія спецыялісты, якія даналадкавалі ўсе механізмы, — кажа Вячаслаў Міхайлавіч. — Зімой распачалі папярэднія будаўнічыя работы — закладвалі фундамент. Купілі сушылку па лізінгу. Каштуе яна, безумоўна, нямала — Br1,7 мільярда.

Кіраўнік, дарэчы, раней займаўся прыватным бізнэсам. Атрымаў добры вопыт. Напэўна, таму і дарыла яму ўзначаліць вялікае сельскагаспадарчае прадпрыемства, у якім працуюць 345 чалавек.

Гаспадарка вельмі актыўна развіваецца дзякуючы таму, што далучылі яе да «Беларуснафта». «Шэфы» забяспечылі новай тэхнікай, парк машын фактычна абнавілі напалову. Сёлета купілі 6 новых трактароў, летась столькі ж новых камбайнаў. Павысілася зарплата. Яна яшчэ параўнальна невялікая — да 800 тысяч. Але, бясспрэчна, падчас жніва камбайнеры могуць атрымаць значна болей. У «Наватара» 980 кароў, а агульны статак дасягае 2, 8 тысячы. Жывёлагадоўля тут таксама мае добрыя перспектывы...

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

Ва ўгоддзі па ягады — у дазволеныя тэрміны

Паводле інфармацыі спецінспекцыі дзяржкантролю за аховай і выкарыстаннем зямель, раслінага свету, лясоў і ландшафтаў Мінпрыроды, у Брэсцкай вобласці брусніцы ўжо можна збіраць з 10 жніўня, пачатак жа збору журавін тут устаноўлены з 5 верасня. У Віцебскай вобласці збіраць брусніцы будзе дазволена з 23 жніўня, журавіны — з 6 верасня. Пайсці ва ўгоддзі на законных падставах па ягады ў Гомельскай вобласці можна будзе адпаведна з 20 жніўня і 10 верасня. На Гродзеншчыне распачаць збор брусніц можна будзе з 15 жніўня, а вось з журавінамі давядзецца пачакаць яшчэ месяц, бо афіцыйны тэрмін пачатку іх збору ўстаноўлены з 15 верасня. На тэрыторыях Мінскай і Магілёўскай абласцей збіраць брусніцы будзе дазволена з 23 жніўня, а журавіны — з 6 верасня. Праўда, па Мінскай вобласці тэрміны збору — папярэднія, не выключана, што яны могуць быць скарэктаваны. Гэтаксама трэба памятаць, што ў асобных раёнах мясцовымі выканаўчымі камітэтамі могуць быць прыняты рашэнні аб устанаўленні больш позніх тэрмінаў пачатку збору дзікарослых ягад. Больш падрабязную інфармацыю можна атрымаць у гар- і райінспекцыях прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя і ў сродках масавай інфармацыі раёнаў. Варта таксама нагадаць, што парушэнне ўстаноўленых тэрмінаў, выкарыстанне забаронных прыладаў ці метадаў збору або нарыхтоўкі грыбоў, іншых дзікарослых раслін ці іх частак або іншае парушэнне правілаў збору ці нарыхтоўкі могуць пацягнуць папярэджанне ці накладанне штрафу ў памеры да 20 базавых велічынь (да 700 тысяч рублёў), на індывідуальнага прадпрымальніка — да 100 базавых велічынь (да 3,5 мільёна рублёў), а на юрыдычную асобу — да 500 базавых велічынь (да 17,5 мільёна рублёў).

Сяргей РАСОЛЬКА.

ДЗЕЦІ АТРУЦІЛІСЯ ПАРАМІ КЛЕЮ

Два браты з Магілёва нанюхаліся клею і трапілі ў рэанімацыю.

Бліжэй да ночы 10 жніўня «хуткая дапамога» даставіла хлопчыкаў з вострым атручэннем парамі клею ў абласную дзіцячую бальніцу. Выявілася, што малыя, якім усяго толькі 11 і 9 гадоў, ужо стаяць на ўліку ў наркалагічным дыспансэры і атрымліваюць там лячэнне.

Алена КАЗЛОВА.

ЛІСА АТАКАВАЛА ТРАКТАРЫСТА

Здарылася гэта ў вёсцы Залесце Добрушскага раёна, калі трактарыст прыватнага ўнітарнага прадпрыемства «Дударава» выйшаў раніцай з дома на вуліцу. Як ён ні адбіваўся ад звярка, той усё ж злаўчыўся і пакусаў яго. Экспертыза яшчэ не ўстанавіла, была ліса шалёнай ці не.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Ваенная прысяга для кожнага воіна — адпраўны пункт салдацкай службы. Клятва на вернасць Радзіме гучала з вуснаў маладых салдатаў у воінскай часці 28729. Дзяніс КОРЖ прымае віншаванні ад дзядулі Сцяпана Пятровіча, ветэрана вайны, падпалкоўніка ў адстаўцы, і сяброўкі Ліды.

МОТАЛЬ НАКОРМІЦЬ ЗАХОДНЮЮ ЕЎРОПУ І ЎСЮ БЕЛАРУСЬ

Першы фестываль ежы, які ў мінулыя выхадныя прайшоў у Моталі, перасягнуў чаканні нават саміх арганізатараў.

Гісторыя гэтага фэсту наступная. Летась упершыню праз усю нашу краіну прайшоў Міжнародны веласіпедны тур салідарнасці з турыстычнай Беларуссю, якую арганізаваў Еўрапейскі цэнтр эка- і агратурызму (ECEAT) і Беларускае грамадскае аб'яднанне «Адпачынак у вёсцы». Стартаваў тур у Белавежскай пушчы і фінішаваў на Расоншчыне. І вось пад канец першага этапа вандроўкі, калі прыкладна трэць шляху, а гэта каля 400 кіламетраў, былі ўжо ў мінулым, веласіпедысты ўзмаліліся аб дадатковым прыпыначным пункце, які спачатку не прадугледжваўся. Справа ў тым, што ўдзельнікі велатуру на начлег спыняюцца ў аграсядзібах, якіх у нас цяпер не так і мала, але пакуль недастаткова, каб прамежак ад адной да другой быў не надта стомным. Вось Валерыя Кліцунова, старшыня праўлення БГА «Адпачынак у вёсцы» і звярнулася да кіраўніцтва Іванаўскага раёна і Мотальскага сельсавета з просьбай прыняць турыстаў і даць ім магчымасць трошкі адпачыць. У выніку гасцям у Моталі так спадабалася і яны былі настолькі ўражаныя захаванай тут народнай культурай, мясцовай гаворкай і асабліва — ежай, што адразу вырашылі і дамовіліся абавязкова заезд у Моталь паўтарыць. І нават не проста заезд, а, каб пабачыць гэты рэгіён ва ўсёй яго красе, — патрапіць на мясцовае свята. Так і нарадзілася ідэя кулінарнага фестывалю «Мотальскія прысмакі», які амбіцыйныя матальчане мяркуюць неўзабаве зрабіць міжнародным.

Іншаземцаў было нямала ўжо і на гэты раз. Пасол Ізраіля з сям'ёй, удзельнікі велатуру, цяпер ужо другога, з Англіі, Францыі, Галандыі, Бельгіі, эксперты ў галіне турызму і іншыя госці. А таксама ў Моталь з'ехаліся прадстаўнікі прэсы, навукоўцы ў сферы этнаграфіі і спецыялісты па турызме.

— Спачатку мы хацелі прымеркаваць фэст да прастольнага Мотальскага свята 19 жніўня — Яблычнага Спаса, — расказвае Алена Дарагакупец, намеснік старшыні райвыканкама. — У гэты дзень спакон веку ў Моталі фэст, які на праваслаўны манер тут называюць Святок. Пасля набажэнства людзі стыхійна ладзілі на плошчы кірмаш і гулянне. Але для велатуру гэта трошкі запозна. Таму ў тэрміновым парадку былі перагледжаныя тэрміны, сабралі мы нашых матальчан і дамовіліся, што прымем гасцей як трэба. Прычым большую частку выдаткаў гаспадары прадпрыемстваў узялі на сябе. Ну, а калі мы ўбачылі, як яны наладзілі сустрэчу, то самі былі ўражаныя. Такога размаху не чакаў ніхто.

(Заканчэнне ў наступным нумары.)



Выдавец кулінарнага часопіса «Bouillon» (Галандыя) Уіл ЯНСЕН спрабуе мотальскае сала.

Удзельніца кулінарнага конкурсу Вольга КАПЕЛЕЦ частуе бабкай свайго ўнука Дзяніса.

ОДО «Консул» (Продавец) совместно с КУП «Минский областной центр учета недвижимости»

ПРОВОДЯТ ОТКРЫТЫЙ АУКЦИОН

по продаже производственной базы ОДО «Консул» (1993—1995 г.п.) в составе: пилорамный цех (об. пл. 354,5 кв.м), лесопильный цех с кран-балкой (об. пл. 356,2 кв.м), столярный цех (об. пл. 356,2 кв.м), административно-бытовое здание (об. пл. 211,8 кв.м), сушилка-котельная (об. пл. 192,9 кв.м), гвоздильный цех (об. пл. 742,5 кв.м), навес для хранения готовой продукции (об. пл. 832 кв.м), водонапорная башня, растворно-бетонный узел, подстанция КТП-400, ж/б забор, покрытие из аэродромных плит ПАГ-14 – расположенной по адресу: Гродненская область, Ошмянский район, д. Буденовка (54 км до г. Вильнюса). Начальная цена с НДС – 1 416 000 000 бел. руб. *Площадь земельного участка – 3,6 га.* Задаток в сумме 50 000 000 бел. рублей перечисляется на р/с № 3012020200010 в Октябрьском отделении ОАО «БПС-Банк», МФО 153001357, КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015. Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 календарных дней с даты проведения аукциона. Объект продается без условий. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения. **Аукцион состоится 11 сентября 2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 10 сентября 2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

Контактный телефон (8017) 224 61 34.
Сайт в интернете: www.rlt.by

УНП 690324015

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 12.08.2008 г. (для б/н разлікаў)

1 долар ЗША	2 111,00
1 еўра	3 175,58
1 латвійскі лат	4 504,43
1 літоўскі літ	919,75
1 чэшская крона	131,42
1 польскі злоты	972,99
1 расійскі рубель	85,92
1 украінская грыўня	455,74

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў

Цэнтрабанк РФ

USD	24,5697
10 UAH	53,0663
1000 BYR	11,6334
EUR	36,7808

Курс у гандлёвых кампаніях (на 11.08.2008 г.)

USD	2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.

ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009

9 771990 763008 08149

Беларусь гатова нарошчваць супрацоўніцтва з Кітаем

(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.)

«І потым: нам трэба падумаць пра стратэгічнае партнёрства, пра больш цесныя адносіны ў палітыцы, — перакананы Аляксандр Лукашэнка. — У нас, вядома, няма ніякіх праблем, але трэба ісці далей, нельга спыняцца. Скажу шчыра: Кітай ужо сёння — імперыя. Але заўтра гэта будзе сусветны лідар, і без Еўропы ім не абысціся. На каго будзе абапірацца Кітай у Еўропе? Там ужо ўсё «разабрана». І неяк здарылася, што Беларусь, здаўна арыентуючыся на Кітай, даказаўшы адданасць нашай дружбе і развіццю адносінаў, засталася краінай, на якую КНР можа абаперціся».

Ён адзначыў, што ўжо цяпер Кітай інвестуе значныя сродкі ў рэалізацыю праектаў у Беларусі. «Але гэтага мала. Беларусь з дапамогай Кітая павінна развівацца так, як развіваўся Пекін напярэдадні Алімпіяды», — заявіў Прэзідэнт.

Адказваючы на пытанні журналістаў адносна знешняга націску на Кітай з боку асобных сілаў, у тым ліку аказаным у час падрыхтоўкі да Алімпіяды, Аляксандр Лукашэнка выказаў перакананасць, што «гэта звычайныя двайныя стандарты».

«Кітай ужо гэту Алімпіяду выграў, ён перамог, прадэманстраваў, на што здольны. Гэта значыць Кітай атрымаў перамогу. Ён ціха, спакойна, ні на кога не рэагуючы, рабіў сваю справу, — дадаў Прэзідэнт. — Што датычыцца Тыбета, Тайваня, правоў чалавека — дык у нас адкрытая пазіцыя. Мы заўсёды заяўлялі: дай Бог у іншых дзяржавах было б столькі правоў чалавека, колькі ў Кітаі. Простым вокам можна заўважыць, які рывок (калі браць правы чалавека) зрабіў Кітай у гэтых адносінах. Раней кітайцам міска рысу была ў радасць. Сёння кітайцы жывуць на сусветным узроўні, яны апранаюць увесь свет. Ад кітайскіх тавараў ужо «дрыжыць» Еўропа. Кітайцы атрымалі права нармальна харчавацца, працаваць, мець нармальную адукацыю. Сваёй працай яны пакарылі свет. Якія яшчэ правы чалавека? Балбатня гэта, не больш. Мы гэта таксама праходзілі ў Беларусі. У кітайскага народа мудрае кіраўніцтва, яно само разбярэцца, што рабіць, як добраўпарадкоўваць сваю краіну. У якім напрамку весці. А тое, што яны ў правільным напрамку рухаюцца — паказала падрыхтоўка да адкрыцця Алімпіяды».

Аляксандр Лукашэнка даў высокую ацэнку дасягненням Кітая ў эканамічным развіцці. Паводле яго слоў, КНР дабілася бліскучых поспехаў. «Ні адна дзяржава ніколі не дэманстравала такіх незвычайных тэмпаў», — падкрэсліў ён.

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што наведвае з візітам КНР пяты раз і знаёмы з жыццём людзей у Кітаі, у тым ліку ў глыбінцы. «Так, у вёсцы ў Кітаі яшчэ ёсць праблемы, але ёсць рэгіёны, дзе быт сялян уладкаваны на еўрапейскім узроўні. Надзвычайныя вынікі! Аб гэтым сведчыць тэмп развіцця краіны. Што тут гаварыць, калі КНР сёння клапоціцца не пра тое, каб тэмп павялічваць, а пра тое, як стрымаць развіццё эканомікі, каб яе не «перагрэць». Кітайцы думаюць аб тым, як менш выпускаць тавараў, ідуць у іншыя дзяржавы, у Беларусь, у Еўропу, у Расію, у Афрыку. І ідуць не толькі з таварамі, але і з інвестыцыямі, будуюць прадпрыемствы ў гэтых рэгіёнах», — сказаў Прэзідэнт.

Пры гэтым Аляксандр Лукашэнка асабліва падкрэсліў, што кітайцы змаглі дабіцца ўсяго гэтага выключна ўласнымі намаганнямі. «Яны гэта ўсё рабілі самі, пакуль не даказалі, што замежным кампаніям можна і трэба ісці ў Кітай. І тыя перанеслі сюды свае прадпрыемствы. Гэта заслуга кітайскага народа», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

У гэты ж дзень адбыўся сяброўскі матч паміж хакейнай камандай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і «змешанай» камандай, дзе разам гулялі і беларускія, і кітайскія аматары хакея. Беларуская дружына перамагла з лікам 9:4.

БЕЛТА.

Сяргей Сідорскі даручыў забяспечыць максімальна высокую якасць збожжа пры ўборцы

Прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі даручыў забяспечыць максімальна высокую якасць збожжа пры ўборцы.

«Мы шмат уклалі ва ўгнаенні, тэхніку і цяпер можам патрабаваць ад сельгасарганізацый яскравае збожжа», — сказаў ён, наведваючы ААТ «Райаграсэрвіс» Смалявіцкага раёна. «Вал — гэта добра, але і якасць збожжа трэба забяспечваць на высокім узроўні», — падкрэсліў кіраўнік беларускага ўрада. Ён запатрабаваў мінімізаваць страты збожжа на ўсіх этапах — ад яго збору і транспарціроўкі да перапрацоўкі. «Збожжа шмат, але кожнае зярнятка нам важна. За кожны кілаграм трэба змагацца», — сказаў прэм'ер-міністр.

Цяпер на палях краіны задзейнічана амаль 12 тыс. камбайнаў і 9 тыс. грузавых аўтамабіляў. Кіраўнік беларускага ўрада лічыць марнатраўствам перавозіць збожжа з палёў у сушылкі аўтамабілямі на доўгія адлегласці. «У Мінскай вобласці я забараніў перавозкі на доўгія адлегласці машынамі. Транспартныя расходы пры зборы збожжа павінны быць мінімальныміі», — растлумачыў ён і дадаў, што збожжа на грузавіках трэба звозіць на бліжэйшыя элеватары, а далей транспартаваць па чыгунцы.

Таксама Сяргей Сідорскі паведаміў, што ў планах урада — пабудаваць на працягу бліжэйшых двух гадоў больш як 1,2 тыс. зернесушыльных комплексаў. Цяпер у гаспадарках рэспублікі створана каля 5,5 тыс. такіх комплексаў, што дасць магчымасць прасушваць дзённа намалот. Аднак з улікам таго, што аб'ёмы вытворчасці збожжа ў краіне штогод павялічваюцца амаль на 10 працэнтаў і ўжо ў бліжэйшыя гады Беларусь можа выйсці на вытворчасць 10 млн тон збожжа, пытанне забеспячэння зернесушылкамі набывае ўсё большую актуальнасць.

Аб'ём вытворчасці алейнага семя рапсу ў Беларусі ў бліжэйшыя адзін-два гады неабходна павялічыць да 1 млн тон. Аб гэтым заявіў прэм'ер-міністр Сяргей Сідорскі.

Асобныя прыватныя структуры закупляюць беларускі рапс, вывозяць яго за мяжу і там вырабляюць прапсавы алей, які ўвозіцца ў рэспубліку па істотна завышаных цэнах. Сяргей Сідорскі звярнуў увагу на неабходнасць адсочвання работы такіх прыватных структур, напрыклад створанага ў Брэсцкай вобласці «Брэстаблрапсу», які закупіў ужо 17 тыс. тон рапсу для вытворчасці алею па названай схеме.

«Мы пакінем рапс у краіне. Гэтыя структуры працуюць не ў дапамогу эканоміцы, а наадварот, каб «цягнуць» з яе. Мы гэтага не дапусцім. Такія прыватныя кампаніі павінны перапрацоўваць рапс тут», — сказаў ён. Кіраўнік урада падкрэсліў, што ўвесь экспарт рапсу будзе ажыццяўляцца па рашэнні спецыяльнай камісіі праз таварную біржу. Паводле слоў Сяргея Сідоркага, для недапушчэння адтоку рапсу за межы рэспублікі ў Беларусі будуць стварацца дадатковыя магутнасці па яго перапрацоўцы, каб павялічыць іх удвая і захаваць цэны на рапсавы алей унутры краіны на прымальным узроўні.

БЕЛТА.

Э. ЗЭЛЬЦЭР ПРЫГАВОРАНЫ ДА ТРОХ ГАДОЎ ПАЗБАЎЛЕННЯ ВОЛІ

Грамадзянін ЗША Эмануіл Зэльцэр прыгавораны да трох гадоў пазбаўлення волі. Аб гэтым карэспандэнту БЕЛТА паведамілі ў Вярхоўным Судзе Беларусі.

Гарадскі суд Мінска, які разглядаў крымінальную справу Эмануіла Зэльцэра, палічыў даказанай яго віну ў камерцыйным шпіянажы і выкарыстанні фальшывых дакументаў. Асуджаны будзе адбываць пакаранне ў папраўчай установе агульнага рэжыму. Разам з тым ён прызнаны невінаватым у перамяшчэнні цераз мяжу Беларусі наркатычных і псіхатропных рэчываў. Грамадзянка Расіі Уладлена Брускова, якая праходзіла па той жа справе, за збіранне камерцыйнай інфармацыі і выкарыстанне фальшывых дакументаў прыгаворана да 1 года пазбаўлення волі ў калоніі агульнага рэжыму.

Кар. БЕЛТА.

УСЁ Ў РУКАХ ЦВК

Такую думку аб справядлівасці правядзення будучых парламенцкіх выбараў выказаў кіраўнік назіральнай місіі АБСЕ на сустрэчы з кіраўніцтвам Цэнтральнай камісіі

Учора кіраўнік місіі назіральнікаў ад Бюро па дэмакратычных інстытутах і правах чалавека АБСЕ Герт-Хінрых Арэнс атрымаў у Цэнтрвыбаркаме пасведчанне міжнароднага назіральніка. Чакаецца, што яго калегі прыбудуць у Беларусь на гэтым тыдні, і місія пачне сваю паўнавартасную работу.

— Гэта беспрэцэдэнтны прыклад, ва ўсякім выпадку ў Беларусі, калі адзін і той жа дыпламат двойчы прызначаецца ў краіне кіраўніком назіральнай місіі, — адзначыла старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына на пачатку сустрэчы.

Яна дадала, што гэта гаворыць аб высокім даверы да яго і самой арганізацыі (АБСЕ), і назіраемага боку (чыноўнікаў, выбаркамаў, краіны ў цэлым).

— Мы гатовыя да супрацоўніцтва, і я мяркую, што тыя формы ўзаемнага абмену і кантактаў, якія мы напрацавалі ў час папярэдняй выбарчай кампаніі, змогуць паспяхова прымяняцца і пры правядзенні цяперашняй кампаніі, — падкрэсліла Лідзія Ярмошына.

Спадар Арэнс у сваю чаргу заўважыў, што ён рады быць у Беларусі, яму падабаецца наша краіна і яе народ. Пры гэтым ён заўважыў: «У любым выпадку мы назіральнікі, і нам трэба заставацца нейтральнымі». Прыгадваючы свой мінулы вопыт работы ў Беларусі, ён падкрэсліў, што імкнуўся прытрымлівацца высокага ўзроўню транспарэнтнасці.

— Для таго, каб мець той жа ўзровень празрыстасці, я б зноў такі прапанаваў, каб мы сустракаліся штотыднёва, — дадаў ён. — Я буду знаёміць вас з тым, што мы атрымліваем ад нашых міжнародных назіральнікаў і з тым, што мы бачым тут, у самім Мінску. Каб вы такім чынам ведалі пэўныя бакі таго, аб чым мы потым будзем дакладваць. Я думаю, гэта ў рамках нашага ўзаемнага інтарэсу. Паколькі вы тады не будзеце здзіўленыя тым, аб чым мы будзем гаварыць, а мы не будзем здзіўляцца, у чым мы не правы, калі пачуем вашы словы.

Кіраўнік назіральнай місіі зрабіў акцэнт на тым, што яму не хочацца рабіць няправільныя заявы, а таксама выказаў спадзяванне на ўзнаўленне супрацоўніцтва, якое пачалося паўтара гады таму:

— Спадзяюся на тое, што мы зможам гэта зрабіць з лепшымі вынікамі, чым у мінулы раз, — падкрэсліў спадар Арэнс. — Аднак гэта ўсё ў вашых руках, паколькі мы толькі назіральнікі, і наш мандат поўнасцю забараняе нам умешвацца ў працэс.

Сказаў ён колькі слоў і пра склад місіі: «Думаю, у нас склалася добрая міжнародная каманда, большасць з нас размаўляюць па-руску». Спадар Арэнс паведаміў і пра сваю нядаўнюю сустрэчу з міністрам замежных спраў Сяргеем Мартынавым, якому ён падзякаваў за «той небюракратычны спосаб адносінаў, з якім мы сутыкнуліся пры атрыманні візаў і вырашэнні адміністрацыйных пытанняў». У самы блізкі час спадар Арэнс плануе сустрэцца з калегамі з місіі назіральнікаў СНД, а з прадстаўнікамі СМІ сустрэча, паводле яго графіка, адбудзецца ўжо сёння.

Што да самой выбарчай кампаніі, то пакуль усё ідзе па звыклым сцэнарыі. Днямі скончылася вылучэнне кандыдатаў для работы ва ўчастковых выбаркамах. Пасля разгляду атрыманых заявак камісіі будуць сфарміраваныя і прыступяць да выканання сваіх абавязкаў ужо 14 жніўня. Пра склад вылучэнцаў журналістам паведаміў сакратар ЦВК Мікалай Лазавік. Паводле яго слоў, партыйцаў сярод кандыдатаў — 1,7 працэнта (з іх 1,6 працэнта — прадстаўнікі апазіцыйных партый). Ён таксама адзначыў, што каля 30 працэнтаў кандыдатаў ва ўчастковыя камісіі вылучыліся ад працоўных калектываў.

Ала МАЧАЛАВА.

АЭС: КІТАЙСКАЯ ПРАПАНОВА

Беларусь атрымала дадатковую магчымасць міжнароднага супрацоўніцтва ў сферы ядзернай энергетыкі

Хто зоймецца будаўніцтвам атамнай электрастанцыі ў Беларусі, дагэтуль вырашаецца. Як мы пісалі раней, Міністэрства энергетыкі накіравала запрашэнні тром асноўным на суседнім рынку кампаніям, якія прапануюць АЭС з вода-вадзянымі рэактарамі трэцяга пакалення тыпу PWR.

Адказы ад іх ужо атрыманыя. Аб гэтым паведаміў на сустрэчы з журналістамі намеснік міністра энергетыкі Беларусі Міхаіл Мясніковіч. І ўдакладніў, што згодна з пасланнем кампаніі Westinghouse-Toshiba (ЗША, Японія) сумесная рэалізацыя праекта будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Беларусі магчымая толькі пасля заключэння міжурадавага пагаднення аб супрацоўніцтве ў сферы мірнага выкарыстання ядзернай энергіі. Намеснік міністра зрабіў акцэнт на тым, што на гэту працэдуру, як паказвае практыка, можа спатрэбіцца некалькі гадоў.

Кампанія AREVA выказала гатоўнасць сустрэцца з прадстаўнікамі беларускага Міністэрства энергетыкі для больш дэталёвага разгляду магчымасцяў супрацоўніцтва ў галіне ядзернай энергетыкі — у дадатак да тых кансультацый, што былі праведзеныя раней. У іх, між іншым, самы шырокі вопыт па будаўніцтве і эксплуатацыі АЭС.

Расійскі бок (дзяржаўная карпарацыя па атамнай энергіі «Расатам») пацвердзіў гатоўнасць рэалізаваць у Беларусі праект будаўніцтва АЭС «пад ключ». Істотны момант у расійскім адказе, які тым самым выгадна адрознівае яго ад астатніх, — прапанова разгледзець таксама і пытанні фінансавання праекта. Старшыня Прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Міхаіл Мясніковіч пры гэтым заўважыў:

— Размова ідзе не толькі аб крэдытаванні, магчымае таксама суфінансаванне, узаемныя паслугі і гэтак далей.

Фінансавае пытанне закрануў у сваёй прапанове і кітайскі бок. Гуандунская ядзерна-энергетычная карпарацыя гатовая да супрацоўніцтва ў сферы мірнага выкарыстання ядзернай энергіі. Намеснік міністра энергетыкі — апроч трох чаканых адказаў ад міжнародных кампаній. Як адзначыў Міхаіл МІхадзюк, у кітайскага боку — 20-гадовы вопыт будаўніцтва і эксплуатацыі АЭС. Апошнім часам краіна актыўна развівае сваю ядзерную праграму.

— Яны распрацоўваюць і свае тэхналогіі на базе французскіх, вырабляюць шмат абсталявання, — праінфармаваў намеснік міністра. — І станцыі іх працуюць без надзвычайных здарэнняў.

У беларуска-кітайскім супрацоўніцтве размова можа ісці аб пастаўках паслуг і абсталявання. У самы блізкі час можна чакаць візіту ў наш край прадстаўнікоў кампаніі AREVA і Кітайскай Гуандунскай ядзерна-энергетычнай карпарацыі. Ва ўсякім выпадку такія запрашэнні ім накіраваныя, у гэтым запэўніў журналістаў Міхаіл Міхадзюк.

Міністэрства энергетыкі, як падкрэсліў спадар Міхадзюк, не выключае магчымасці будаўніцтва АЭС у кансорцыуме. А законам «Аб выкарыстанні атамнай энергіі», які ўжо ўступіў у сілу, не абмяжоўваецца і права ўласнасці будучай станцыі. Таму зусім не абавязкова, што яна будзе толькі дзяржаўнай.

— Мы будзем разглядаць усе прапановы патэнцыйных партнёраў, — дадаў намеснік міністра.

Ва ўсякім выпадку гэта будзе шырока інтэграваны праект, пэўны ўдзел у якім возьмуць і айчынныя прадпрыемствы. Дзе будзе пабудаваная АЭС, таксама пакуль невядома. Аднак ужо першага верасня ў ўраду Беларусі будуць прадстаўленыя вынікі даследавання ўсіх трох пляцовак, на якіх патэнцыйна можа быць узведзена атамная электрастанцыя, — Астравецкай, Краснапалянскай і Кукшынаўскай. На падставе падрыхтаваных заключэнняў і будзе прымацца рашэнне аб тым, дзе весці асноўнае і рэзервовае праектаванне. Нагадаем, што ні на адной з іх не выяўлена забараняльных фактараў для будаўніцтва АЭС. А такі руплівы адбор пляцоўкі для будаўніцтва атамнай электрастанцыі ў Беларусі, паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, нават выклікае здзіўленне замежных спецыялістаў. Старшыня Прэзідыума НАН прыгадаў прыказку «Сем разоў адмер — адзін раз адрэж», маўляў, мы ўжо некалькі разоў па сем адмералі... На яго думку, інфармацыі для прынятия рашэння па пляцоўцы ўжо дастаткова.

Не менш важнае пытанне — выбар кадраў для работы на АЭС. Паводле слоў намесніка міністра, падрыхтоўка спецыялістаў будзе весціся па трох накірунках. Спецыялістаў будуць выпускаць айчынныя ВНУ. Зразумела, у далейшым іх чакае стажыроўка на дзеючых АЭС. Акрамя таго, там жа будуць праходзіць перападрыхтоўку і вопытныя энергетыкі, якія раней працавалі на электрастанцыях. Запросяць і тых спецыялістаў, якія паехалі з Беларусі і працуюць на дзеючых станцыях у іншых краінах. Паводле слоў спадара Міхадзюка, такія ахвотнікі ёсць.

Ала МАЧАЛАВА.

Пакуль народ смяецца, ён на зямлі жыве!

Рэпартаж з колаў

...Людзі кажуць: той, хто пачаў, — зрабіў палавіну. Не ведаю, як вы, а я гэтым словам веру, бо для мяне пачаць...

Адна з аўцючак суцешыла, сказала, што яно ў многіх так: хочаш песню зацягнуць — адразу словы забудзешся.

Са словамі — праблем як быццам няма, а вось з уражаннямі...

То па парадку. Дзень прыезду, значыць. Каленкавічы, як называюць горад больш сталыя жыхары... Прэс-канферэнцыю на гадзінку адклалі — вольны час...

Апаведна — плошча (ужо без правадыра, прынамсі, у цэнтры), потым — універмаг, аддзел мужчынскага адзення. З прымерачнай каласок выглядае. У новым пінжаку... Дэманструе, пытаецца моўчкі: «Ну як?». Прадавачка: «О-о, можна ў гулі ісці!». Мужык (жаласна): «Хто ж мяне пусціць?» Жонка яго тут жа: «А каб ты на вяроўцы гуляў!..».

Аўцюкі ўжо. Дакладней — подступы да іх, Вялікіх (яшчэ Малыя ёсць). Наш картэж на ўзлеску спыняецца. Месца для адпачынку там хораша зроблена — са сталом з распілаванага кругляка, з такім ж дабротнымі лавамі. Пакуль круцімся, разглядаем, здымаем, камандуюць ехаць. Да свайго аўтобуса нам далекавата, да машыны суправаджэння — рукой падаць. Укуліліся (разам з каляжанкамі), паехалі. Нешта сказалі. Вадзіцель перапытаў.

— Спадар, мусіць, не разумее па-беларуску? — «здагадалася» я.

— Не, спадар трохі глухаваты, — прызнаўся вадзіцель.

— А як жа такіх у міліцыю бяруць?

— Калі бралі, я чуў яшчэ...

Аканіць жарт не паспяваем, бо ў гэтыя ж імгненні Аўцюкі на гарызонце з'яўляюцца — святочны натоўп, мытня. І над усім гэтым — бусел. А ўжо хораша, вольна...

— Сфатаграфаваць бы!..

— Мы яго тры тыдні дрэсіравалі, — кажа той жа вадзіцель.

Шкада: часу не было ближэй пазнаёміцца, пабалакаць, распытаць з якіх ён Аўцюкоў. Адметныя тут мясціны! Крынічкі гумару што ні крок б'юць, дзе ні ступі! Пісьменнік Уладзімір Ліпскі ведаў гэта з урада́, як кажуць, бо, лічы, тутэйшы... І не пашкадаваў ні часу свайго, ні сілаў для таго, каб перакананаць іншых: у мінулыя выхадныя ў Аўцюках, Калінкавічах і шэрагу навакольных вёсак у шосты раз ужо адгрымеў, адшумеў, адзвінеў Усебеларускі фестываль народнага гумару.

Валянціна ДОЎНАР.

(Заканчэнне будзе.)

АСНОЎНАЯ ГРУПА БЕЛАРУСКІХ ДЗЯЦЕЙ, ЯКІЯ ЗНАХОДЗІЛІСЯ НА АЗДАРАЎЛЕННІ Ў ЗША, ВЯРНУЛАСЯ Ў МІНСК

Групу з 24 дзяцей сустрэлі ў Нацыянальным аэрапорце Мінск.

«Разам з тым беларускі бок прадаўжае звяртацца з амерыканскімі ўладамі па вырашэнні пытання з нашай няпоўнагадовай грамадзянкай», — заявіла ў аэрапорце начальнік аддзела прэс-службы ўпраўлення інфармацыі МЗС Беларусі Марыя Ваньшына. Паводле яе слоў, беларускі бок выходзіць з таго, што «дзяўчынка павінна свабодна вярнуцца ў Беларусь».

Падтрымка для інтэрнэт-паслуг

З пачатку жніўня ў Мінску пачаў дзейнічаць Цэнтр тэхнічнай падтрымкі паслуг доступу ў інтэрнэт і перадачы дадзеных «Белтэлекам», які працуе кругласутачна і без выхадных дзён. Набраўшы кароткі нумар «123», кожны ахвотны можа атрымаць тэхнічную падтрымку па інтэрнэт-паслугах і паслугах перадачы дадзеных, якія прадастаўляе насельніцтву «Белтэлекам»: высокахуткасным доступе ў інтэрнэт bylfy, камутуемым доступе ў інтэрнэт, доступе па выдзеленай лініі, доступе з гарантаванай паласой прапускання, аб'ядненні карпаратыўных сетак па VPN, паслугах хостынгу, бесправадным доступе ў інтэрнэт па картах Wi-Fi і інтэрактыўным тэлебачанні. Цэнтр абслугоўвае толькі абанентаў г. Мінска. Званок на нумар «123» — бясплатны.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Спорт-тайм

МТЗ адарваўся ад праследавальнікаў

У нядзелю пяцшю матчамі завяршылася праграма 18-га тура чэмпіянату краіны па футболе ў вышэйшай лізе. У цэнтральным матчы тура сталічны МТЗ-РІПА выйграў (3:0) у Віцебску ў аднаго са сваіх канкурэнтаў у барацьбе за прызавое месца. Ужо на 45-й секундзе матчу «Віцебску» стала дрэнна — Ерамчук пазмагаўся ў штрафной і арганізаваў узяцце варот. У сярэдзіне другой паловы сустрэчы сімпатычны гол атрымаўся ў Страхановіча, пераможную кропку паставіў Вячаслаў Глеб на 89-й хвіліне.

Нечаканасць адбылася ў Мінску на «Дынама», дзе таксама быў зафіксаваны буйны лік (1:4) і таксама на карысць гасцей. Другі год запар мінчане не могуць абыграць сваіх аднаклубнікаў з берагоў Буга. Падапечныя Ігара Крыўшэнкі павялі ў ліку ўжо на 7-й хвіліне пасля ўдару Рака, але далей рэалізацыя момантаў у гаспадароў сапсавалася. Брэсцкае «Дынама» ў сваю чаргу рэалізавала большую частку сваіх магчымасцяў, дубль на рахунку Мазалеўскага.

Нарэшце адзначылася перамогай над «Савітам» жодзінскае «Тарпеда»(1:0), якое не выйгравала шэсць тураў запар. Таксама перамогі ў «Граніта» над «Нафтанам» (3:1) і салігорскага «Шахцёра» над «Нёманам» (2:1). БАТЭ ўнічыю згуляла ў Магілёве з мясцовым «Дняпром» (3:3), «Гомель» прымаў «Смаргонь і прайграў (0:1), «Дарыда» дома саступіла «Лакаматыву» (0:2).

Доктар адкажа

Гэтымі днямі дзяжурыць на тэлефоннай «гарачай» лініі Міністэрства аховы здароўя (222 70 80) плануюць:

12 жніўня — галоўны ўрач 13-й сталічнай гарадской паліклінікі Людміла Мікалаеўна БАРАУЛЯ.

13 жніўня — галоўны ўрач 34-й цэнтральнай раённай паліклінікі г. Мінска Дзмітрый Яўгенавіч ШАЎЦОЎ.

«Гарачая» лінія ўпраўлення аховы здароўя Мінаблвыканкама (017) 220 20 25

12 жніўня

9.00—12.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы Алена Леанідаўна БОГДАН.

14.00—17.00 — намеснік галоўнага ўрача Мінскай абласной клінічнай бальніцы Анатоль Іванавіч СЯДЫХ.

Абзац

■ **Дзяўчынка, усяго годзік, з Аршанскага раёна патанула ў пральнай машыне «Рыга» ў той час, калі яе маці выйшла на вуліцу, каб развесіць бялізну. У выніку праверкі, якую правяла пракуратура, установлена, што гэта было няшчаснае здарэнне. Крымінальная справа не ўзбуджалася.**

■ Больш чым на Br2,3 трыльёна, або на 22,1 працэнта, павялічыліся за студзень—ліпень гэтага года ўкладаў насельніцтва ў беларускіх банках. У пераліку на нацыянальную валюту яны дасягнулі амаль 13 трыльёнаў Br. На пачатак жніўня рублёвыя дэпазіты склалі каля 8,5 трыльёна Br, а ў замежнай валюце — больш за 2,1 мільярда долараў ЗША ў эквіваленце. Павелічэнне ўкладаў сведчыць аб росце даверу насельніцтва да банкаўскай сістэмы і працэнтнай палітыкі, якую праводзіць Нацыянальны банк.

■ **У Беларусі беспрацоўе знізілася да 0,9 працэнта да колькасці эканамічна актыўнага насельніцтва. На 1 жніўня гэтага года, на ўліку па беспрацоўі стаялі 42 тыс. 254 беспрацоўныя (для параўнання: на 1 ліпеня гэтага года іх было 42,7 тыс., на 1 чэрвеня — 44,9 тыс., на 1 жніўня мінулага года — 46,7 тыс.).**

■ Падпісаны пашпарты гатоўнасці ўсіх інтэрнатаў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Засяленне пачнецца 25 жніўня. У новым навучальным годзе месцы ў інтэрнатах будуць прадстаўлены каля 55 працэнтаў тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Асаблівая ўвага будзе нададзена першакурснікам: для іх зарэзервавана каля 25 працэнтаў месцаў. Студэнты, якія не атрымалі месцы ў інтэрнаце, змогуць скарыстацца электроннай базай дадзеных аб кватэрах і пакоях, якія здаюцца ўнаём. Гэтыя звесткі размешчаны на афіцыйным сайце БДУ ў раздзеле «Студэнты». Акрамя таго, з 21 жніўня па 5 верасня з 8.30 да 18.00 у студэнцкім гарадку будзе працаваць гарачая тэлефонная лінія (тэл. 328 52 79) па пытаннях засялення.

■ **Дзве незалежныя групы навукоўцаў з Каліфарнійскага ўніверсітэта распрацавалі два новыя тыпы матэрыялу, якія дазволяць у хуткім часе стварыць «адзенне-нябачніка», паведамляюць інфармагенцтвы. Для дасягнення гэтай мэты навукоўцы выкарысталі эфект пераламлення святла. Адны спецыялісты распрацавалі тканіну, што складаецца з найтанчэйшага срэбнага дроту, а тканіна другіх нагадвае рыбалоўную сетку, у аснове якой знаходзіцца слой з металу. Спецыяльна створаныя структуры, якія называюцца метаматэрыяламі, валодаюць уласцівасцямі, што не сустракаюцца ў жывой прыродзе, напрыклад, адмоўным індэксам пераламлення. Новая тэхналогія дазваляе змяняць напрамак святла, аднак з-за абмежаванай даўжыні хвалі гэтыя матэрыялы не змогуць зрабіць нябачнымі буйныя аб'екты, напрыклад, схаваць будынкі ад спадарожнікаў.**

■ Беларускія памежнікі затрымалі 8 нелегальных мігрантаў з Ірана і Турцыі. 8 жніўня ў пункце пропуску «Каменны Лог» смаргонскія памежнікі затрымалі чатырох грамадзян Турцыі, якія па падробленых дакументах спрабавалі патрапіць з Беларусі ў Літву. 10 жніўня за 300 м ад дзяржмяжы брэсцкія памежнікі затрымалі чатырох грамадзян Ірана. Яны спрабавалі ў абыход пункта пропуску «Варшаўскі мост» перабрацца ў Польшчу, каб там атрымаць статус бежанцаў. Двое з затрыманых былі няпоўнагадовыя ва ўзросце 15 і 17 гадоў.

■ **Пяць чалавек загінулі ў мінулую суботу ў выніку ДТЗ на адным са скрыжаванняў Ліды. Віноўнікам стаў вадзіцель аўтамашыны «Міцубісі», які не справіўся з кіраваннем, выехаў на сустрэчную паласу руху і ўрэзаўся ў «Аўдзі», што ехала насустрач. У гэтай машыне знаходзілася сям'я: муж з жонкай і дваімі маленькімі дзецьмі, кіраваў аўто бацька жонкі. У выніку сутыкнення двое пасажыраў «Аўдзі» загінулі на месцы, яшчэ трое ад атрыманых раненняў памерлі ў бальніцы. У салоне «Міцубісі» таксама знаходзіліся пяцёра чалавек, усе яны атрымалі траўмы рознай ступені цяжкасці.**

■ У адной з гандлёвых сетак Літвы Rimi з'явіцца пакеты, якія свецяцца. Ідэя аб нанясенні флуарэсцэнтных святлоадбівальных пазнак на поліэтыленавыя пакеты для пакупак належыць міністру транспарту і сувязі Літвы Альгірдасу Буткявічусу. На яго думку, гэтая мера магла б засцерагчы пешаходаў, якія ідуць у цёмны час сутак уздоўж дарог або пераходзяць дарогі на нерэгулюемых пешаходных пераходах, што, у сваю чаргу, знізіць смяротнасць на дарогах краіны. Асацыяцыя гандлёвых прадпрыемстваў Літвы адмовілася фінансаваць праект пакетаў, якія свецяцца. Прадстаўнікі дзвюх з трох найбуйнейшых гандлёвых сетак Maxima і Iki паведамілі, што пакеты з флуарэсцэнтнай фарбай доўга разбураюцца, а гэта супярэчыць іх эка-філасофіі.

■ **Да 100 зорак у гадзіну можна будзе ўбачыць на бясхмарным небе ў ноч з 12 на 13 жніўня. Менавіта тады самы значны і відовішчны метэорны паток года Персеіды дасягне свайго піку.**

■ Рэканструкцыя перасадачнага вузла мінскага метрапалітэна зацягваецца. Замест планаваных першых дзён верасня адкрыццё станцыі Кастрычніцкая перанясуць яшчэ на месяц. Пад зямлёй устаноўка чатырох стужак эскалатараў аказалася больш працаёмкай, чым разлічвалі з самага пачатку. Толькі на дэмантажных работы пайшло амаль два месяцы. Столькі ж спатрэбіцца на ўстаноўку новага абсталявання.

■ **Алень-сірата па мянушцы Бэм-Бэм лічыць сваёй сям'ёй зграю гончых сабак, якая належыць брытанскаму паляўнічаму. Калі аленянё знайшлі каля варот дома Томпсана, яму была ўсяго адна гадзіна ад нараджэння. Зараз, праз 10 тыдняў, Бэм-Бэм ужо ўпэўнены, што з'яўляецца адной з прыкладна 60 гончых паляўнічага. Сабакі падзяляюць яго ўпэўненасць, ставячыся да аленя сапраўды гэтак жа, як і да сваіх сабратаў. Па памеры алень цяпер амаль не адрозніваецца ад сабакі.**

Поўны абзац

■ Былы школьны настаўнік і мусульманскі прапаведнік 84-гадовы нігерыец Махамед Бэла Абубакар жыве з 86 жонкамі і 170 дзецьмі. Як лічыць сам мнагажонец, ён валодае лекарскімі здольнасцямі, якія і прыцягваюць да яго жанчын. Як галава сямейства можа ўтрымліваць такую вялікую колькасць жонак і дзяцей, застаецца загадкай. Ні сам Абубакар, ні яго жонкі не працуюць. Аднак сям'я з'ядае кожны дзень не менш чым тры мяшкі рысу па 12 кг коштам $915.

■ **Кіраўнік федэральнага агенцтва Нігерыі, якое займаецца распрацоўкай нафтавых радовішчаў на поўдні краіны, арыштаваны ў пятніцу. Сэм Ідэм заплаціў каля чатырох мільёнаў долараў чараўніку, які абяцаў навесці псоту і забіць іншага дзяржаўнага службоўца з тым, каб выгодныя кантракты пасля перайшлі да Ідэма. Ідэм спаліў два мільёны долараў у мясцовай валюце на магічнай цырымоніі. Пасля таго як магічныя рытуалы не спрацавалі, Ідэм запатрабаваў у чараўніка вяртання грошай, аднак той адмовіўся. Пазней чараўнік заявіў паліцыі, што Ідэм вінаваты яму не менш за два мільёны долараў.**

Паводле паведамленняў карэспандэнтаў «Звязды» і інфармагенцтваў.

ЧАЦВЁРТЫ ДЗЕНЬ ВАЙНЫ Ў ПАЎДНЁВАЙ АСЕЦІІ

Трагедыі

11 жніўня ў зоне грузіна-асецінскага канфлікту працягваліся баявыя дзеянні. З зоны канфлікту пастаянна паступаюць супярэчлівыя паведамленні аб стратах бакоў, а таксама аб ходзе баёў у цэлым.

Улады Грузіі не выпускаюць з краіны 360 грамадзян Расіі

Такія лічбы прыводзіць расійскае МЗС, спасылаючыся на пасольства Расіі ў Грузіі. Паводле інфармацыі міністэрства, сотні грамадзян Расіі паскардзіліся ў пасольства РФ на тое, што ім не даюць пакінуць Грузію. Раней расійскія ўлады, у тым ліку і прэзідэнт краіны Дзмітрый Мядзведзеў, неаднаразова заяўлялі аб тым, што грузінскі бок перашкаджае выезду з Грузіі грамадзян Расіі.

У Цхінвалі прыбыла калона з расійскай гуманітарнай дапамогай

Калона МНС з больш чым 80 машын з расійскай гуманітарнай дапамогай прыбыла ў Цхінвалі ў 15.50 па маскоўскім часе. У горад дастаўлена харчаванне, пітная вада, генератары электрычнасці і мабільныя шпіталі. Раней ад камітэта інфармацыі і друку ўрада Паўднёвай Асеціі паступалі паведамленні аб тым, што грузінскія войскі аднавілі абстрэл населеных пунктаў у Паўднёвай Асеціі і зрабілі шэсць залпаў па Цхінвалі. Аднак пазней было ўдакладнена, што жыхары Цхінвалі маглі прыняць за абстрэл гукі артылерыйскіх гармат, з якіх расійскія войскоўцы вядуць агонь па пазіцыях грузінскіх войскаў на вышынях каля горада. У самім Цхінвалі разрываў не назіраецца.

МЗС РФ налічыла ў Паўднёвай Асеціі 1600 загінулых мірных жыхароў

Паводле ўдакладненай інфармацыі Міністэрства замежных

Выпрабавана на сабе

«МНЕ ЗВЕРХУ БАЧНА ЎСЁ...»

Карэспандэнт «Звязды» ўдзельнічаў у верталётным патруляванні

На верталёце аўтар гэтых радкоў раней не лятаў. Зрэшты, не толькі ён, а пераважная большасць нашых суайчыннікаў. Аб гэтым можна меркаваць са слоў камандзіра верталётнага звяна Цэнтральнага аэраклуба ДТСААФ (г. Мінск), пілота з больш чым трыццацігадовым стажам Уладзіміра Уласевіча, які ўжо не адзін раз патруляваў. Падобныя акцыі заўсёды з цікавасцю ўспрымаюцца мясцовым насельніцтвам, суправаджаюцца шматлікімі «фотасесіямі» на фоне верталёта, альбо, калі дазволяць, у яго кабіне. І пляцоўка каля райцэнтра Свіслач, дзе мы спыніліся на дазапраўку, не стала выключэннем. Асаблівы інтарэс быў праяўлены, вядома, тутэйшай дзятвой. Адзін хлопчык нават звярнуўся да Уладзіміра Уласевіча з просьбай, каб яго ўзялі ў верталёт да Мінска, а адтуль, маўляў, бацька забярэ машынай.

Пры гэтым нават не ўзнікла пытання, што ўзяць з сабой у палёт. Хаця, як на ўласным вопыце пераканаўся карэспандэнт «Звязды», пра абарону органаў слыху ад шуму верталётнага рухавіка паклапоціцца варта. Для гэтага можна прымяніць навушнікі, бірушы альбо, на худы канец, проста затычкі з ваты. А вось світэр, які на ўсялякі выпадак быў узяты, у кабіне верталёта зусім не спатрэбіўся: «тэмпературныя» адчуванні падчас палёту такія ж, як і ў салоне аўтамабіля...

Перад пачаткам верталётнага патрулявання сваімі ацэнкамі набытага вопыту (гэта была ўжо чацвёртая і, можна не сумнявацца, не апошняя акцыя на тэрыторыі вобласці) падзяліўся намеснік начальніка ўпраўлення ДАІ УУС Гродзенскага аблвыканкама Анатоль Клімаў. Аказваецца, нічога «экзатычнага» тут няма, верталётнае патруляванне прымянялася і раней, часцей за ўсё ў савецкія часы. Аднак пасля распаду СССР, пэўна, па прычыне недастатковага фінансавання гэты метад кантролю Дзяржаўтаінспекцыяй, прынамсі, у нас у Беларусі, доўгі час не прымяняўся...

Верталётнае патруляванне перш за ўсё праходзіць над магістральнымі аўтадарогамі. Парушэнні выяўляюцца супрацоўнікам ДАІ, які знаходзіцца ў кабіне верталёта і працуе ў тандэме з наземнымі патрулямі. З верталёта перадаюцца па рацыі на зямлю паведамленні аб тых ці іншых парушэннях, і яны, адпаведна, спыняюцца. Як правіла, гэта парушэнні правілаў абгону, дарожнай разметкі. З кабіны верталёта можна таксама візуальна вызначыць перавышэнне хуткасці. Акрамя таго, ёсць ужо факты, калі выяўляліся нецвярозыя вадзіцелі. Кантроль з неба датычыцца і веласіпедыстаў, пешаходаў, а таксама... ачагоў самагонаварэння ў лясных масівах, паколькі зверху, можна пагадзіцца са знакамітай песняй, і сапраўды бачна ўсё.

— Аднак мэта верталётнага патрулявання — не толькі ў выяўленні парушэнняў, — адзначае Анатоль Уладзіміравіч. — Гэта даволі эфектыўная прафілактычная мера. Уяўціце сабе сітуацыю, калі вадзіцель транспартнага сродку неадэкватна, жорстка паводзіць сябе на дарозе і раптам над ім завісае верталёт з патрульнай афарбоўкай ДАІ. Відавочна, што ўжо сваёй прысутнасцю ён прадухіляе далейшыя парушэнні правілаў дарожнага руху. Людзі едуць, да прыкладу, па магістральнай аўтадарозе Мінск—Гродна і ведаюць, што, акрамя наземнага патрулявання, ёсць яшчэ і паветранае, прычым з куды большым, чым у аўтамабіляў, полем агляду...

Фота Яраслава ВАНЮКЕВІЧА.

За сем месяцаў гэтага года на тэрыторыі Гродзенскай вобласці адбылося 440 дарожна-транспартных здарэнняў, у якіх 96 чалавек загінулі, а 475 былі траўмаваныя. Зарэгістраваны 4331 факт кіравання транспартнымі сродкамі ў нецвярозым стане, 26 тысяч 384 выпадкі перавышэння хуткасці. 11 тысяч 744 парушэнні дапушчаны пешаходамі.

Інфармацыя аб маючым адбыцца верталётным патруляванні зусім не трымаецца Дзяржаўтаінспекцыяй у сакрэце ад удзельнікаў дарожнага руху. Больш за тое, ДАІ зацікаўлена ў тым, каб яны аб гэтым ведалі і акуратна сябе паводзілі. Вось і на гэты раз па мясцовым радыё было агучана, над якімі аўтадарогамі вобласці будзе працаваць паветраны патруль.

...Верталёт «МІ-2» стартуе з пляцоўкі побач з будынкам абласной ДАІ. Ужо ў паветры старшы інспектар батальёна дарожна-патрульнай службы абласной Дзяржаўтаінспекцыі, капітан міліцыі Аляксандр Ручыц паказвае паперу (размаўляць у навушніках практычна немагчыма) з маршрутам сённяшняга рэйду. Як потым удакладніў Уладзімір Уласевіч, максімальная вышыня палёту складала 450 метраў, мінімальная — 150. Найбольшая ж хуткасць дасягала 150 кіламетраў у гадзіну.

Існуе магчымасць не толькі візуальнага назірання, але і фотавідэафіксацыі. Зрэшты, аб парушэннях — пасля пасадкі, а пакуль журналісту толькі і застаецца, што назіраць з неба за раптам не такімі ўжо і знаёмымі аб'ектамі горада над Нёманам (не надта проста адразу зарыентавацца), а затым — вёскамі і палямі, ужо абмалочнымі альбо з тэхнікай за працай. У прыватнасці, без праблем можна было ўбачыць, што экіпажу камбайнераў у поле дастаўлены абед. А на адной з вясковых вуліц чалавек дзесяць, што былі там у гэты момант, па зразумелай прычыне, як па камандзе, паднялі галовы ўверх.

Менш чым праз гадзіну — першая пасадка ў Свіслацкім раёне. Аляксандр Ручыц паведамляе, што, пакуль мы сюды ляцелі, у Гродзенскім і Ваўкавыскім раёнах былі зафіксаваны два парушэнні правілаў дарожнага руху, а дакладней — абгону, калі аўтамабілі перасякалі суцэльную лінію разметкі з выездам на сустрэчную паласу. Падобнае парушэнне, адзначае А. Ручыц, пры сутыкненні з сустрэчным транспартам можа мець вельмі цяжкія наступствы, і таму прымяняюцца санкцыі аж да пазбаўлення вадзіцельскіх правоў.

Дарэчы, парушэнні правілаў абгону пераважалі і напярэдадні, калі верталёт патруляваў аўтамагістралі, што вядуць са сталіцы ў Ашмяны да мяжы з Літвой, а таксама ў Гродне. Акрамя таго, у Шчучынскім раёне затрымалі п'янага скутэрыста, на трасе Мінск—Вільнюс праследавалі джып, які не спыніўся на патрабаванне наземнага патруля і кінуў «жартаваць» толькі тады, калі ўбачыў над сабой верталёт з сімволікай ДАІ. А ў дувх выпадках вадзіцелям аказалі дапамогу пасля паломкі іх аўтамабіляў: Аляксандр Ручыц зразумеў, што яны не проста так сігналізуюць рукамі верталёту, і паведаміў аб гэтым сваім калегам на зямлі.

Хвілін праз дваццаць пасля дазапраўкі верталёта ў патруляванні разам з Аляксандрам Ручыцам пачынаюць удзельнічаць яго калегі са Свіслацкага райаддзела міліцыі — начальнікі службаў ДАІ і прафілактыкі маёры міліцыі Валянцін Сідаркевіч і Васіль Бычак.

— Пара цяпер для нас даволі напружаная, — гаворыць Валянцін Сідаркевіч. — Людзі выязджаюць на прыроду, да вадаёмаў і пры гэтым нярэдка сядаюць за руль «пад градусам». Увогуле ж з пачатку года на тэрыторыі раёна выяўлена больш за 90 вадзіцеляў, якія кіравалі транспартам у нецвярозым стане. Шэсць чалавек у дарожна-транспартных здарэннях атрымалі траўмы і адзін загінуў. Таму сённяшні рэйд, першы, але, спадзяюся, не апошні ў Свіслацкім раёне, вельмі важны.

Мажліва, нават сам факт, што ў раёне будзе праходзіць верталётнае патруляванне, паўплываў на паводзіны некаторых вадзіцеляў, паколькі правілы дарожнага руху падчас паветранага рэйду па Белавежскай пушчы, тэрыторыі трох сельсаветаў раёна не парушаліся. Праўда, у лясным масіве, паведаміў Васіль Бычак, быў выяўлены адзін самагонны апарат — ужо 45-ы па ліку з пачатку года, але першы — з неба.

Верталёт зноў вяртаецца для дазапраўкі на пляцоўку каля Свіслачы, пасля чаго бярэ курс у напрамку Слоніма... Увогуле за два дні з дапамогай верталётнага патруляванні на тэрыторыі Гродзеншчыны было выяўлена 46 парушэнняў. Але не менш важнае значэнне, згодны з супрацоўнікамі ДАІ камандзір верталётнага звяна Уладзімір Уласевіч, мае іх прафілактыка:

— Ужо два гады мы працуем разам з Дзяржаўтаінспекцыяй на Міншчыне і бачым, што вадзіцелі там сталі менш парушаць тыя ж правілы абгону, перасякаць суцэльную лінію разметкі ў параўнанні з рэгіёнамі, дзе верталётнае патруляванне пачалося нядаўна.

Асабліва запатрабаванымі паветраныя патрулі будуць, пэўна, тады, калі на змену старой тэхніцы прыйдуць сучасныя, значна менш затратныя ў расходзе паліва верталёты.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	5.43	20.45	15.02
Віцебск —	5.28	20.39	15.11
Магілёў —	5.33	20.35	15.02
Гомель —	5.35	20.27	14.52
Гродна —	5.59	20.59	15.00
Брэст —	6.04	20.55	14.51

Месяц

Першая квадра.

Месяц у сузор'і Казярога.

Імяніны

Пр. *Анатоля, Валянціна, Германа, Івана, Лукі, Максіма, Сілы.*

К. *Клары, Алега, Інакенція, Леха, Юльяна.*

НАДВОР'Е на заўтра

...у суседзяў

ВАРШАВА +23..+25°С	КІЕЎ +32..+34°С	РЫГА +21..+23°С
ВІЛЬНЮС +26..+28°С	МАСКВА +23..+25°С	С.-ПЕЦЯРБУРГ +22..+24°С

Дзве даты

12 жніўня

1399 год — адбылася бітва на рацэ Ворскла (левы прыток Дняпра). Войска Вялікага Княства Літоўскага пад камандаванем вялікага князя Вітаўта было акружана і разбіта войскам Залатой Арды. Сам Вітаўт з рэшткамі сваёй арміі змог выратавацца. Гэтае паражэнне стала адной з прычын падпісання ў 1401 годзе Віленска-Радамскай уніі ВКЛ з Польшчай.

1953 год — у Сяміпалацінску праведзена першае выпрабаванне вадародная бомбы. Вадародная бомба — састарэлая назва ядзернай бомбы вялікай разбуральнай сілы, дзеянне якой заснавана на выкарыстанні энергіі, што выдзяляецца пры рэакцыі сінтэзу лёгкіх ядраў.

Цытата дня

«Чалавек заняты тым, ад чаго ён чакае шчасця, але яго сапраўднае шчасце ў тым, што ён заняты».

Эміль Агюст Шарцье (1868—1951), французскі літаратурны крытык.

АСІНА

● Святых апосталаў Сілу і Сілуана, якія ўшаноўваюцца 12 жніўня, у народным асяроддзі ўспрымалі літаральна па іх імёнах і іх «сілай» надзялялі менавіта хлеб: «Сіла хлеб сіліць».

● Таксама лічылася, што «святая Сіла дадасць мужыку сілы» сабраць ураджай і засеяць новае поле: «Хто пасее жыта на Сілу — народзіць яна сільна», «Хто на Сілу жыта пасее, у таго на хлеб надзея».

● Каб пазбавіцца ад болю ў суставах ці радыкуліту, збіралі лапухоавае лісце — па тры лісты з кожнага куста, не больш, сушылі на печцы. Затым сушанае лісце прыкладалі да хворых месцаў тры разы — на тры Спасы (14, 19 і 29 жніўня).

● На Сілуана сушылі венік з асіны. Знахары «правілі» ім сурочанага чалавека і варажылі над цяжкахворым чалавекам: будзе жыць ці не.

● На Сілу і Сілуана «захоўваці» карову ад ведзьмака — у варотах падворка і па кутках хлява ставілі маладзенькія асінавыя дрэўцы ці забівалі асінавыя калы.

Асіна — прыгожае, стройнае ліставое дрэва, якое ў народнай культуры стала сімвалам страху, палахлівасці і няўпэўненасці — яго закругленае лісце дрыжыць пры кожным павеве ветру. Лічыцца, што асіна «крадзе» (пяглынае, забірае да сябе) энэргію чалавека. У казках Дабрыня павесіў Змея Гарыныча менавіта на асіну — каб той не вярнуўся да жыцця. Завостраны асінавы кол — «Перунова паліца» — быў моцным сродкам барацьбы з ведзьмакамі, калдунамі і ваўкалакамі. З асіны рабілі барану, якой абганялі вёску ў час барацьбы з эпідэміямі. У хрысціянскай культуры асіна атрымала назву «іудзіна дрэва», таму што Іуда павесіўся менавіта на асіне. З таго часу і трымціць асіна, калі ўзгадвае аб самазабойстве здрадніка Хрыстовага: «Зларадніе Іуда на асіне задавіўся, а на алешыне кроў пускаў, таму асіна мае горкі смак, а сырая алешына — крывавы колер».

● Цікавы факт: асіна — дрэва з мяккай драўнінай, якая ў той жа час найменш з усіх астатніх падпадае пад уплыў гніення. Працягласць жыцця гэтага дрэва — больш за 100 гадоў. З асіны вырабляюць самыя трывалыя старчакі для маставой.

● Калі пакласці асінавае палена ў мех з нягашанай вапнай, яна не будзе вільготнай і не «запарыцца»; калі пакласці кавалак асіны ў цэбар з квашанай капустай — яна не забродзіць і не скісне.

● Прыкмячалі: калі на асіне вялікія пупышкі — да ўраджаю ячменю, асіна з «завушніцамі» — да ўраджаю аўса.

Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.

Усміхнёмся

Дзяўчына, вярнуўшыся з вясельнага вандравання, тэлефануе маці:

— Мама, я вельмі шчаслівая!

— Цікава, раскажы!

— Дык вось, слухай: я ўчора ўпершыню прыгатавала мужу абед!

— Ну і як, паспяхова?

— Яшчэ як: ён вырашыў наняць кухарку!

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

Закон Рэспублікі Беларусь

АБ УНЯСЕННІ ЗМЯНЕННЯЎ І ДАПАЎНЕННЯЎ У НЕКАТОРЫЯ ЗАКОНЫ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ПЫТАННЯХ РЭКЛАМЫ

Прыняты Палатай прадстаўнікоў 17 чэрвеня 2008 года
Адобраны Саветам Рэспублікі 28 чэрвеня 2008 года

Артыкул 1. Унесці ў Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях ад 21 красавіка 2003 года (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2003 г., № 63, 2/946; № 87, 2/980; № 139, 2/1004; 2007 г., № 305, 2/1401) наступныя змяненні:

1. Назву і частку 1 артыкула 12.15 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 12.15. Парушэнне заканадаўства аб рэкламе

1. Парушэнне рэкламадаўцам, рэкламавытворцам, рэкламараспаўсюджвальнікам або службовай асобай дзяржаўнага органа заканадаўства аб рэкламе, у тым ліку размяшчэнне (распаўсюджанне) рэкламараспаўсюджвальнікам на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь рэкламы, што падлягае ўзгадненню з упаўнаважаным дзяржаўным органам, без такога ўзгаднення або рэкламы прадукцыі, тавараў (работ, паслуг), якія выраблюцца на гэтай тэрыторыі, выраблена з прыцягненнем замежных або міжнародных юрыдычных асобаў (арганізацый, якія не з'яўляюцца юрыдычнымі асобамі), замежных грамадзян або асобаў без грамадзянства, акрамя выпадкаў, калі заканадаўчымі актамі дазволены такі выраб, —

цягне накладанне штрафу ў памеры ад дваццаці да пяцідзесяці базавых велічынь.».

2. Назву і частку 1—3 артыкула 12.26 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 12.26. Парушэнне заканадаўства аб рэкламе алкагольных напояў, піва, слабаалкагольных напояў, тытунёвых вырабаў і парадку рэалізацыі алкагольных напояў і тытунёвых вырабаў

1. Парушэнне індывідуальным прадпрымальнікам або службовай асобай юрыдычнай асобы ўстаноўленага парадку рэкламы алкагольных напояў, піва і слабаалкагольных напояў, якія выявілася ў выкарыстанні прыз арганізацыі і правядзенні гуманітарных мерапрыемстваў наймення відаў і гандлёвых марак алкагольных напояў, бясплатным (бязвыплатным) распаўсюджанні алкагольных напояў, піва, слабаалкагольных напояў (за выключэннем дэгустацый, якія ажыццяўляюцца ў маркетынгавых мэтах), у тым ліку ў прадаставленні больш чым пяці літраў такіх напояў у якасці прызоў (падарункаў) пры правядзенні конкурсаў, латарэй, гульняў, іншых гульнёвых, рэкламных, культурных, адукацыйных і спартыўных мерапрыемстваў, пары, або ў арганізацыі і правядзенні такіх мерапрыемстваў у мэтах стымулявання рэалізацыі алкагольных напояў, піва, слабаалкагольных напояў, —

цягне накладанне штрафу ў памеры ад пяцідзесяці да ста базавых велічынь.

2. Парушэнне індывідуальным прадпрымальнікам або службовай асобай юрыдычнай асобы ўстаноўленых забарон у адносінах да рэкламы тытунёвых вырабаў, якое выявілася ў размяшчэнні (распаўсюджанні) рэкламы тытунёвых вырабаў, бязвыплатным распаўсюджанні тытунёвых вырабаў, а таксама прапанове грамадзянам, якія купляюць тытунёвыя вырабы або прадстаўляюць доказы такой куплі, тавараў або правоў на ўдзел у конкурсах, латарэях, гульнях, іншых гульнёвых і рэкламных мерапрыемствах, пары, —

цягне накладанне штрафу ў памеры ад пяцідзесяці да ста базавых велічынь.».

Артыкул 2. Артыкул 25 Закона Рэспублікі Беларусь ад 20 ліпеня 2006 года «Аб лекавых сродках» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2006 г., № 122, 2/1258) выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Артыкул 25. Рэклама лекавых сродкаў

Рэклама лекавых сродкаў ажыццяўляецца ў адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь аб рэкламе.».

Артыкул 3. Унесці ў Закон Рэспублікі Беларусь ад 10 мая 2007 года «Аб рэкламе» (Нацыянальны рэестр прававых актаў Рэспублікі Беларусь, 2007 г., № 119, 2/1321) наступныя дапаўненні і змяненні:

1. У артыкуле 2:

абзац пяты пасля слова «латарэі,» дапоўніць словамі «гульні, іншыя»;

*(Абзац трэці не прыводзіцца як не ўступіўшы ў сілу.)**

*(Абзац чацвёрты не прыводзіцца як не ўступіўшы ў сілу.)**

*(Абзац пяты не прыводзіцца як не ўступіўшы ў сілу.)**

2. У абзаца пятага артыкула 7 словы «і тытунёвых вырабаў» выключыць.

3. У артыкуле 10:

у абзацы трэцім пункта 8 словы «заведчаных аўдытарскай арганізацыяй або аўдытарам — індывідуальным прадпрымальнікам» замяніць словамі «дакладнасць якіх пацвярджана аўдытарскай арганізацыяй (аўдытарам — індывідуальным прадпрымальнікам)»;

пункт 10 дапоўніць абзацамі дзясятым—дванаццатым наступнага зместу:

«работ, паслуг (дзейнасці) гіпнатызёраў, экстрасэнсаў, варажбітак, спірытаў, астролагаў, чарадзеяў, прадракалькінаў, іншых асобаў, якія абвяшчаюць сябе або лічаць здольнымі прадказваць падзеі, уздзейнічаць на людзей, духоўны свет, маёмасць, навакольнае асяроддзе шляхам выкарыстання звышнатуральных здольнасцяў або сілаў;

*(Абзац пяты не прыводзіцца як не ўступіўшы ў сілу.)**

паслуг сэксуальнага характару, у тым ліку пад выглядам псіхалагічнай дапамогі, стасункаў, рэлаксацыі, масажу, прыемнага баўлення часу, іншай законнай дзейнасці.».

4. Частку другую пункта 1 артыкула 15 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Забараняюцца рэклама метадаў прафілактыкі, дыягностыкі і лячэння хваробаў, медыцынскіх тэхналогій і лекавых сродкаў, не дазволеных Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, а таксама рэклама работ, паслуг (дзейнасці) у галіне народнай медыцыны, якія не з'яўляюцца работамі, паслугамі, што складаюць медыцынскую дзейнасць (медыцынскай дзейнасцю), у тым ліку размяшчэнне (распаўсюджанне) такой рэкламы арганізацыямі аховы здароўя, іншымі арганізацыямі і індывідуальнымі прадпрымальнікамі, якія маюць ліцэнзію на ажыццяўленне медыцынскай дзейнасці.».

5. У артыкуле 17:

у пункце 1:

з абзацаў першага і дванаццатага словы «і тытунёвых вырабаў» выключыць;

з абзаца дзясятага словы «і тытунёвых вырабаў» і «і вырабаў» выключыць;

абзац адзінаццаты дапоўніць словамі «, за выключэннем выкарыстання такіх вобразаў у зарэгістраваных тавараных знаках, якія выкарыстоўваюцца для абазначэння алкагольных напояў»;

з абзаца трынаццатага словы «і вырабаў» выключыць;

пункт 3 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«3. Забараняюцца размяшчэнне (распаўсюджанне) рэкламы тытунёвых вырабаў, бясплатнае (бязвыплатнае) распаўсюджанне тытунёвых вырабаў, у тым ліку выкарыстанне іх у якасці прызоў (падарункаў) пры правядзенні конкурсаў, латарэй, гульняў, іншых гульнёвых, рэкламных, культурных, адукацыйных і спартыўных мерапрыемстваў, пары, а таксама прапанова грамадзянам, якія купляюць тытунёвыя вырабы або прадстаўляюць доказы такой куплі, тавараў або правоў на ўдзел у конкурсах, латарэях, гульнях, іншых гульнёвых і рэкламных мерапрыемствах, пары.»;

пункт 4 выключыць;

з пунктаў 5—7 словы «і тытунёвых вырабаў» выключыць.

6. У артыкуле 18:

у пункце 1:

абзац дзясяты дапоўніць словамі «, за выключэннем выкарыстання такіх вобразаў у зарэгістраваных тавараных знаках, якія выкарыстоўваюцца для абазначэння піва»;

дапоўніць пункт часткай другой наступнага зместу:

«Патрабаванні абзацаў першага—дзявятага часткі першай гэтага пункта не распаўсюджваюцца на рэкламу піва, якая ўтрымлівае выключна інфармацыю аб вытворцах піва, у тым ліку іх найменні (фірменным найменні), і зарэгістраваных таварных знаках, якія выкарыстоўваюцца для абазначэння алкагольных напояў, за выключэннем такой рэкламы ў будынках (памяшканнях, збудаваннях) арганізацый сістэмы адукацыі, арганізацый аховы здароўя.»;

дапоўніць артыкул пунктам 3 наступнага зместу:

«3. Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь могуць быць устаноўлены іншыя абмежаванні на рэкламу піва і слабаалкагольных напояў.».

7. Дапоўніць Закон артыкулам 21[1] наступнага зместу:

«Артыкул 21[1]. Рэклама культурна-відовішчных мерапрыемстваў

1. Рэклама культурна-відовішчных мерапрыемстваў суб'ектам гастрольна-канцэртнай дзейнасці дазваляецца пасля атрымання пасведчання на права арганізацыі і правядзення культурна-відовішчнага мерапрыемства на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь (далей — пасведчанне), за выключэннем выпадкаў, калі атрыманне пасведчання не патрабуецца.

2. У рэкламе культурна-відовішчнага мерапрыемства павінны быць указаны інфармацыя аб суб'екце гастрольна-канцэртнай дзейнасці, яго кантактных тэлефонах, даце выдачы і нумары пасведчання, органе, які выдаў пасведчанне (за выключэннем выпадкаў, калі выдачы пасведчання не патрабуецца), спецыфіцы культурна-відовішчнага мерапрыемства (наяўнасць або адсутнасць фанаграмы), якое праводзіцца, а таксама іншая інфармацыя, прадугледжаная заканадаўствам.».

8. Частку трэцюю пункта 2 артыкула 23 выкласці ў наступнай рэдакцыі:

«Рэклама латарэі, электроннай інтэрактыўнай гульні або рэкламнай гульні, якія праводзяцца на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, за выключэннем рэкламы на радыё і вонкавай рэкламы, павінна ўтрымліваць нумар пасведчання аб рэгістрацыі латарэі, электроннай інтэрактыўнай гульні або пасведчанні аб дзяржаўнай рэгістрацыі правілаў правядзення рэкламнай гульні, дату рэгістрацыі латарэі, электроннай інтэрактыўнай гульні ў дзяржаўных рэестрах латарэй, электронных інтэрактыўных гульняў або дату прынятця рашэння аб дзяржаўнай рэгістрацыі правілаў правядзення рэкламнай гульні, а таксама найменне органа, які выдаў адпаведнае пасведчанне.».

9. Абзац восьмы пункта 2 артыкула 26 пасля слова «латарэй,» дапоўніць словамі «гульняў, іншых».

10. Артыкул 27 дапоўніць пунктам 3[1] наступнага зместу:

«3[1]. Калі размяшчэнне (распаўсюджанне) рэкламы дапускаецца ў адпаведнасці з гэтым Законам або іншымі актамі заканадаўства пры наяўнасці ў арганізацыі або грамадзяніна іншых дакументаў, акрамя прадугледжаных пунктамі 1—3 гэтага артыкула, рэкламавытворца і рэкламараспаўсюджвальнік маюць права патрабаваць, а рэкламадаўца абавязаны прадаставіць копіі такіх дакументаў з прад'яўленнем іх арыгіналаў.».

11. Артыкул 33 выключыць.

Артыкул 4. Гэты Закон уступае ў сілу праз месяц пасля яго афіцыйнага апублікавання.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА

5 жніўня 2008 года, г. Мінск.
№ 428—З

** Абзацы трэці—пяты пункта 1 і абзац пяты пункта 3 артыкула 3 Закона Рэспублікі Беларусь «Аб унясенні змяненняў і дапаўненняў у некаторыя законы Рэспублікі Беларусь па пытаннях рэкламы» не ўступілі ў сілу ў адпаведнасці з часткай восьмай артыкула 100 Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.*

Организация сдает в аренду
СКЛАДСКОЕ ПОМЕЩЕНИЕ
в г. Молодечно (центр), 2-этажное, 1400 кв. м., h-4, 2 лифта, кран-балка, хороший ремонт, по цене 3 евро кв. м.
Возможна продажа.
Тел.: 8 029 3 04 06 40, 8 029 775 58 14, 8 01773 7 79 13.
УНН 600414766

Спецыяльны карэспандэнт «Звязды» перадае з Пекіна

150 грамаў, якія змянілі серабро на бронзу

У адрозненне ад папярэдняй алімпіяды ў Афінах, дзе беларусам амаль тыдзень прыйшлося чакаць першую ўзнагароду, на гэты раз усё атрымалася намнога хутчэй — на другі гульнявы дзень. Цяжкаатлетка ў вагавай катэгорыі да 53 кг, прадстаўніца Жодзіна Настасся Новікава яшчэ да алімпійскіх стартаў значылася ў прэтэндэнтках на адну з узнагарод. Свае амбіцыі на месца пад сонцам яна паказала яшчэ тры гады таму на сусветным першынстве ў Катары. Аднак тады па волі лёсу на цэлыя два гады была дыскваліфікаваная за допінг. Па словах спартсменкі, ёй параілі ўжываць біялагічна актыўныя дабаўкі, якія, як высветлілася пазней, былі несертыфікаваныя і ўтрымлівалі забароненыя да ўжывання прэпараты. Цяпер беларуска значылася адной з фаварытак сярод удзельніц фінальнай пулькі. І свайго шанцу не ўпусціла: штуршок 118 кг — і першая бронза. Галоўны трэнер каманды Аляксандр Ганчароў у мікс-зоне адзначыў: зноў цяжкаатлетам выпаў гонар медальнага пачыну. Як вядома, чатыры гады таму першую сярэбраную ўзнагароду заваявала Ганна Бацюшка.

Падчас цырымоніі ўзнагароджання на твары Новікавай былі слёзы і радасці, і суму адначасова. Пазней Насся прызналася, што яна думкамі ўжо была з серабром, аднак... Карэянка Ён Джыні паказала аднолькавы вынік з нашай спартсменкай і аказалася на 150 грамаў лягчэйшай. На галаву вышэй за ўсіх была спартсменка з Тайланда Яроенратанатаракун. Калі дадаць другую частку прозвішча, то ўсяго атрымаецца 41 літара...

На жаль, пачын Новікавай не змог падтрымаць яе калега Віталь Дзербянёў (56 кг). Зрэшты, за некалькі гадзін да яго выхаду на памост настаўнік беларусаў Аляксандр Ганчароў падкрэсліў, што Дзербянёву разлічваць на прызавыя месцы не даводзіцца, аднак пастараемся максімальна да іх наблізіцца. Не атрымалася: у другім практыкаванні — штуршку — штанга вагой 140 кг перастала слухацца беларуса. У выніку атрыманы «бублік».

Па гарачых слядах удалося спытаць міністра спорту Аляксандра Грыгарава наконт бягучых спраў у айчыннага спартсменаў на пекінскай алімпіядзе. Аляксандр Уладзіміравіч выказаў задавальненне, што першая ўзнагарода ў скарбонку беларускай каманды прыйшла даволі аператыўна, што не можа не радавать. А вось непакоіць, падкрэсліў шэф місіі, што адкрыта засудзілі нашага баксёра Рамазана Магамедава (81 кг). Спартсмен, які двойчы паслаў у накдаўн егіпцяніна Ясера Рамадана і меў значную перавагу над сапернікам, па ўзмаху судзейскай рукі быў вымушаны сысці з дыстанцыі. Як старшыню Беларускай федэрацыі бокса Аляксандра Грыгарава гэта вельмі ўстрывожыла. У працяг баксёркай тэмы падкрэслім, што на першай стадыі барацьбы выбыў яшчэ адзін беларускі атлет Магамед Нурудзінаў (69 кг) — па вачах ён уступіў прадстаўніку Віргінскіх астравоў Джону Джэксану. Міністр спорту падзяліўся развагамі з журналістам «Звязды» і аб сітуацыі з перспектывамі беларускіх плыўцоў і плыўчых на Гульнях у Пекіне. Ён выказаў шкадаванне наконт таго, што перад самымі стартамі ў жаночай эстафеце атрымала траўму рукі Святлана Хахлова. У выніку спартсменка не выйшла і на дыстанцыю 100 метраў брасам.

Увогуле, як і меркавалася, лаўраў на пекінскай алімпіядзе беларускім плыўцам наўрад ці ўдасца адшукаць: ужо выбылі з далейшай барацьбы Віктар Вабішчэвіч, Павел Санковіч, а таксама Іна Капішына — у сваіх заплывах на 100 метраў брасам яны не змаглі прайсці кваліфікацыю. Не коціць удача пакуль і да стралкоў. Хоць Вікторыя Чайка ў стральбе з пнеўматычнага пісталета на 10 м была за адзін крок ад бронзавага медаля. Але грузінку Ніно Салуквадзэ ў фінальнай серыі дастаць не ўдалося. Чацвёртае месца Чайкі настаўнік беларускіх стралковых Ігар Басінскі ацаніў як нармальны вынік, хоць, вядома, хацелася большага, бо быць чацвёртым заўсёды крыўдна. Учора ж не прайшоў кваліфікацыю наш стралок з пнеўматычнай вінтоўкі Віталь Бубновіч, які заняў 18-е месца.

У святле цяперашняга расійска-грузінскага канфлікту многія журналісты з небяспекай чакаюць фінальных паядынкаў барцоў і дзюдаістаў, дзе традыцыйна моцныя рускія і грузіны. Праўда, прадвеснікамі магчымай сустрэчы «сілавікоў»-алімпійцаў сталі «трысцінкі»-жанчыны ў стральбе. Расіянка Наталля Падзерына і грузінка Ніно Салуквадзэ, прапусціўшы наперад кітайскую спартсменку Гуа Веньюн, не толькі стаялі побач на п'едэстале, але і стралялі па-суседску. Абышлося без эксцэсаў. Як вядома, па няпісаных законах у час алімпіяды ўсе войны павінны быць спыненыя. У выпадку, калі баявыя дзеянні ідуць, то спартсмены краіны, якая з'яўляецца агрэсарам, павінны добраахвотна здымацца са спаборніцтваў. Пасля фінальнай стральбы расійскія журналісты спыталі прадстаўніцу Грузіі наконт гэтага правіла, на што Салуквадзэ адказала: спорт — гэта палітыка, але ж у вялікую палітыку яна не ўмешваецца.

Затое ў спорт смела ўмешваецца надвор'е. Учора неба над Пекінам было шчыльна зацягнутае дажджавымі хмарамі, але ж ліўню, як напярэдадні, не было. На радасць арганізатарам тэніснага турніру былі прадоўжаныя паядынкі, перарваныя з-за моцнага дажджу. На жаль, непагода не стала выратавальнай палачкай для Максіма Мірнага і Вольгі Гаварцовай, якія гулялі адпаведна супраць немца Нікаласа Кіфера і амерыканкі Сірэны Уільямс. У выніку двухдзённай барацьбы Мірны ўступіў саперніку з Германіі 0:3, а Гаварцова з такім жа лікам амерыканцы, 5-й ракетцы свету ў рэйтынгу АТР — 0:3. За дзень да пачатку тэніснай гонкі ў алімпійскай вёсцы, дзе пражываюць беларускія спартсмены, я сустрэўся з Максімам Мірным і пацікаваўся яго думкамі аб жараб'ёўцы. Беларус выглядаў даволі ўпэўнена, сказаўшы, што «ўсё нармальна». А наконт сустрэчы са старым знаёмым Кіферам, адным з лепшых германскіх тэнісістаў, беларус па-філасофску адказаў: «Як ёсць — так ёсць». У гэты ж дзень Мірны здаў кроў на аналіз. Кіраўнік медыцынскай групы Яўген Ласіцкі падкрэсліў: пасля хваробы, з-за чаго Мірны не змог згуляць заключны матч Кубка Дэвіса ў Мінску супраць палякаў, трэба абавязкова праверыць аналізы тэнісіста. Як-ніяк, спартсмен прымаў лекі...У вячэрняй праграме, калі раптам над Пекінам не спусціцца дождж, які абяцалі сіно

Напярэдадні 75-годдзя прадпрыемства крычаўскія цэментнікі паспяхова справіліся з урадавым заданнем

Від на трэцюю тэхналагічную лінію ВРУП «Крычаўцэментнашыфер».

Уручэнне прэміі за якасць генеральнаму дырэктару Мікалаю ДУДЫКУ намеснікам Прэм'ер-міністра Рэспублікі Беларусь Андрэем КАБЯКОВЫМ.

ЦЭМЕНТ ЁСЦЬ!

Крычаўскі цэментавы набліжаецца да свайго 75-годдзя. З пункту гледжання гістарычнай навукі — гэта невялікі прамежак часу. Але ў яго ўмясцілася не адна эпоха з жыцця калектыву: індустрыялізацыя, вайна, аднаўленне, пачатак сучаснага трыумфу.

У 1929 годзе Усесаюзны Савет Народнай Гаспадаркі СССР зацвердзіў праект будаўніцтва завода па вытворчасці 130 тысяч тон цэменту ў год у мястэчку Крычаў на Беларусі. Рашэнне было прынятае на падставе комплексных даследаванняў. Яны паказалі, што геалагічная, дэмаграфічная, транспартная сітуацыі ў зоне будаўніцтва дазволяць вырабляць цэмент найбольш танна.

23 лістапада 1933 года завод быў здадзены ў эксплуатацыю. Першыя гады калектыў набіраўся вопыту. Не хапала кадраў, здараліся паломкі абсталявання, прастоі, парушэнні тэхналогіі. Але ўрэшце цяжкасці былі пераадоленыя. Ужо да вайны Крычаў стаў цэнтрам цэментавай прамысловасці Беларусі.

У час вайны завод быў разбураны. Немцы спрабавалі аднавіць яго, але гэта ім не ўдалося: мясцовыя падпольшчыкі зрывалі планы акупантаў.

Пасля вызвалення вытворчасць цэменту ў Крычаве была наладжана, а завод на працягу свайго існавання не аднойчы рэканструяваўся, павялічваў магутнасць. Аб гэтым паведаміў вядучы інжынер па інфармацыйнай рабоце, рэдактар шматтыражнай газеты «Наши новости» Аляксандр Балдоўскі.

Сёння «Крычаўцэментнашыфер» — перадавое прадпрыемства, якое разам з іншымі цэментавымі заводамі краіны вырашае надзённыя задачы нова га будаўніцтва і экспартных паставак. Прадпрыемства ў прамым сэнсе працвітае. Кожная зялёная выспачка на яго тэрыторыі палымнее вясёлкаю кветак, упрыгожаная скульптурнымі кампазіцыямі і больш нагадвае тэрыторыю адпачынку, чым плошчу прамысловага гіганта. І гэта ў той час, як тут колькі месяцаў назад вялося будаўніцтва — завод-ветэран уводзіў у строй новыя дадатковыя магутнасці. Генеральным падрадчыкам будаўніцтва новай (трэцяй) печы выступала ААТ «Трэст «Шахтаспецбуд» Белдзяржканцэрна па нафце і хіміі. Гэтай арганізацыяй быў выкананы асноўны аб'ём будаўнічых работ, у тым ліку праду гледжаныя праектам мерапрыемствы па ахове працы і навакольнага асяроддзя, забеспячэнні пажарнай і выбуховай бяспекі.

ВРУП «Крычаўцэментнашыфер» вяло будаўніцтва як за кошт уласных сродкаў, так і за кошт дзяржаўных крэдытаў.

На выраб новай печы быў аб'яўлены тэндар, які праводзіў канцэрн «Белрэсурсы». Сярод чатырох канкурэнтаў перамагло ААТ «Электрастальскі завод цяжкага машынабудавання» з Расіі. Для гэтага прадпрыемства заказ з Беларусі быў першым і ў многім вызначальным. Ажыццявіўшы выраб першай печы, электрастальскі завод пачынае спецыялізавацца на вырабе абсталявання для цэментавай прамысловасці.

Агульная вага металаканструкцый новай печы складае 2700 тон, магутнасць электрапрывода 630 кВт, даўжыня печы — 170 метраў, дыяметр — пяць метраў. На печы ўстаноўлена эканамічная камбінаваная газавая фарсунка адной з заходніх фірмаў. Мантаж дапамагала ажыццяўляць РУП «Мінскспецрамонт». Работы па аўтаматызацыі функцыянавання печы выканала фірма «Белсофтсістэмы» з Мінска. Кіраванне ўсімі працэсамі спякання клінкеру на новай тэхналагічнай лініі праводзіцца цераз камп'ютар. Пылаўлоўліванне непасрэдна ад печы ажыццяўляецца цераз высокаэфектыўныя электрафільтры: выкіды складаюць не больш за 48 міліграм на адзін кубаметр паветра (пры гранічна дазволенай норме ў 50 міліграм). Такім чынам, новы аб'ект не парушыў экалагічнай абстаноўкі ў горадзе і навакольлі.

Першы пускавы комплекс новай вытворчасці быў здадзены дзяржкамісіі яшчэ напярэдадні новага 2008 года. Затым, у лютым, адбыўся пробны пуск печы. Яму папярэднічала асвячэнне аб'екта святарамі мясцовай царквы айцамі Грыгорыем і Андрэем. Адпраўляючы печку «ў доўгае плаванне», аб яе разбілі традыцыйную бутэльку шампанскага. Пасля таго як адзін з лепшых абпальшчыкаў клінкеру Валянцін Кусман запаліў газавую фарсунку, печ пачала працаваць у рэжыме разагрэву і праз пэўны час выдала першую прадукцыю.

Увод новых магутнасцяў на «Крычаўцэментнашыферы» — гэта адзін з пунктаў дзяржаўнай праграмы рэканструявання галіны. У сувязі з ростам попыту на цэмент на ўнутраным рынку і ў блізкім замежжы колькі гадоў таму ўрад прыняў меры для павелічэння вырабу цэменту. Крычаўцы са сваімі абавязкамі па праграме справіліся выдатна — трэцяя печ была ўведзена ў строй датэрмінова. 27 чэрвеня гэтага года камісія на чале з генеральным дырэктарам прадпрыемства Мікалаем Мікалаевічам Дудыкам падпісала акт прыёмкі другога пускавога комплексу трэцяй тэхналагічнай лініі па абпальванні клінкеру. Яе праектная гадзінная магутнасць ужо склала 65 тон. Кошт прынятых у эксплуатацыю новых асноўных фондаў склаў 57,5 мільярда рублёў, з якіх на будаўніча-мантажныя работы прыйшлося 28 мільярдаў.

Зараз штогод на прадпрыемстве плануецца выраблять каля 1,7 млн тон цэменту.

— Пуск новай печы стаўся экзаменам для калектыву, — кажа начальнік вытворча-тэхнічнага аддзела Ніна Міхайлаўна Топанава, — і гэты экзамен здадзены на выдатна. Новую печ вызначаюць многія тэхнічныя і тэхналагічныя навінкі, якія бліскуча асвоены эксплуатацыйнікамі. Яе прадукцыйнасць паддаецца рэгуляванню, што важна для дасягнення максімальнай прадукцыйнасці. Урэшце, з пускам новай печы адкрыліся больш чым сто новых рабочых месцаў, што для Крычава стала сапраўдным святам.

Між тым з уводам новых магутнасцяў калектыву трэба вырашыць яшчэ шмат праблем. Палягаюць яны ў сферы забеспячэння вытворчасці і збыту. Сёння, калі новая лінія толькі здадзена, пакупнікоў пад поўны будучы аб'ём вытворчасці яшчэ недастаткова. Варта прыкласці шмат намаганняў, каб не затаварыцца, аднавіць вытворчыя сувязі, якія былі парушаны часовай забаронай пастаўкі цэменту на экспарт. Было б добра, каб прадпрыемству была прадастаўлена большая прастора і ў вызначэнні кошту сваёй прадукцыі.

Ніна Міхайлаўна адзначыла, што, пашыраючы выраб цэменту ў краіне, трэба мець на ўвазе хеевічы і Каменка ля Крычава.

Зразумела, што пускам трэцяй тэхналагічнай лініі выраб цэменту ў Крычаве не абмяжуецца і мясцовых вытворцаў чакаюць новыя будоўлі.

Зацікаўленасць у вытворчасці цэменту на Беларусі праяўляюць як на Захадзе, так і на Усходзе. У нашу краіну ўжо прыязджала дэлегацыя найбуйнейшай кітайскай карпарацыі «Шандонг Шаншуі Цэмент Груп» (28 заводаў, магутнасць 50 млн будматэрыялаў у год) на чале з яе генеральным дырэктарам спадаром Чжаа Ліпінам. Кітайцы ўжо гатовы штогод пастаўляць беларусам цэмент у аб'ёме каля 1,2 млн тон і абсталяванне для прадпрыемстваў галіны.

Аб перспектывах супрацоўніцтва з кітайцамі я гутару з галоўным інжынерам «Крычаўцэментнашыфера» Аляксандрам Баравіковым.

— Мы — дзяржаўнае прадпрыемства, — кажа ён. — Якога партнёра нам выбера ўрад, з тым і будзем працаваць: кітайцы дык кітайцы. Зразумела, будзе моўны бар'ер, складанасці з тэхнічнай дакументацыяй, але калі да нас прыйдуць кітайцы, то мы будзем не як да іх прыстасоўвацца. Што тычыцца тэхнічнага супрацоўніцтва, то кваліфікацыя нашых спецыялістаў дазваляе працаваць з любой фірмай свету. Галоўнае ў гэтым супрацоўніцтве — шчырасць другога боку, прафесіяналізм, імкненне зразумець калег.

Для чытачоў вашай газеты я хачу патлумачыць спецыфіку вырабу цэменту на нашым прадпрыемстве. У свеце існуюць два спосабы вытворчасці цэменту — сухі і мокры. Першы выкарыстоўваецца для вырабу цэменту з горнай пароды — вапняку. Утрыманне вільгаці ў ім — максімум дзесяць працэнтаў. Другі спосаб прадугледжвае выраб цэменту з мелу. Утрыманне вільгаці ў меле даходзіць да дваццаці і болей працэнтаў. На мікраўзроўні вапняк і мел маюць розную крышталічную структуру і адпаведна патрабуюць рознага тэхналагічнага абсталявання для прамысловай апрацоўкі. У нашым радовішчы Каменка ўтрыманне вільгаці ў меле складае да 32 працэнтаў, мел вызначаецца павышанай адгезіяй (ліпучасцю). Таму традыцыйна мы выкарыстоўваем цэмент па так званай вільготнай тэхналогіі. Зразумела, што адносна сухой тэхналогіі мы затрачваем больш энергіі для таго, каб прыгатаваць выходную сыравіну, паменшыць яе вільготнасць. Тут усё зразумела. Але іншага шляху няма! У нас няма іншай выходнай сыравіны. Тэхналогіяй на Беларускім цэментавым заводзе ў Касцюковічах прадугледжаны выраб цэменту па сухім спосабе з такой жа выходнай сыравіны, як наша. Ніякай рэальнай эканамічнай аддачы гэта тэхналогія не дала. Вось афіцыйныя лічбы абагульненых энергазатрат па вытворчасці цэменту на прадпрыемствах рэспублікі за 2007 год:

ВРУП «Крычаўцэментнашыфер» — 191 кілаграм умоўнага паліва на тону гатовага цэменту;

ВРУП «Беларускі цэментавы завод» (Касцюковічы) — 201,4;

ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» (Ваўкавыск) — 198,2.

Заходнія фірмы вельмі скептычна паставіліся да навацыі вырабляць цэмент з нашай сыравіны сухім спосабам. «Калі б хаця дваццаць працэнтаў вільгаці, то можна было б паспрабаваць», — зазначылі немцы. Але кітайцы запэўніваюць, што неабходнае абсталяванне для гэтага вырабяць. Магчыма, такі эксперымент і варты ажыццяўлення, але ці не лепей (калі гэта гранічна неабходна) пабудаваць на нашым прадпрыемстве яшчэ адну печ па традыцыйнай тэхналогіі? Тым больш што і месца для яе маецца, і вопытныя кадры ёсць для эксплуатацыі. Праўда, пад новую печ будуць патрабавацца больш важкія фінансавыя ўкладанні. Трэба будзе павялічваць магутнасці кар'ера, сыравіннага цэха, цэха памолу, але ўсё ж гэта танней, чым распачынаць будаўніцтва ў чыстым полі. Танны цэмент мы ўмеем вырабляць.

Вось такое меркаванне выказаў пра недалёкія перспектывы галоўны інжынер.

Пацвярджэнне яго праваты знайшлося ў інтэрнэт-выданні «Строительство и недвижимость» *(http://www.nestor.minsk.by/sn/2001/14/sn11415.html)*:

Краіна	Удзельны расход цеплыні на абпальванне тоны клінкеру (кг ум. паліва)	
	сухі спосаб	вільготны спосаб
Балгарыя	170,0	222,0
Венгрыя	131,0	299,3
Польшча	141,1	255,0
Былы СССР	159,2	228,1
Францыя	135,0	—
Вялікабрытанія	114,3	207,5
Германія	101,5	—
Швейцарыя	128,3	—
Іспанія	131,0	—
Японія	118,3	188,3
ЗША	154,0	224,3

Табліца не новая. Аднак з яе бачна, хто і з якой энергастратнасцю вырабляў і вырабляе цэмент у свеце. Апроч таго, відавочна, што і за мяжой не грэбуюць вільготным спосабам вытворчасці цэменту. Калі няма іншай сыравіны.

Тэрыторыя прадпрыемства — як кветка

1

2

3

5

Увогуле «Крычаўцэментнашыфер» ніколі не стаяў на месцы. У мінулым годзе, нягледзячы на разгорнутае будаўніцтва трэцяй печы, на прадпрыемстве быў уведзены ў строй бельгійскі сепаратар фірмы «Magotteaux». Дзякуючы яму крычаўцы пачалі вырабляць і пастаўляць на экспарт цэмент М 550-Д0 і М 600-Д0. Эфект ад выкарыстання навінкі — эканомія энергарэсурсаў і павышэнне вытворчасці цэменту на 10 працэнтаў.

Галоўны энергетык прадпрыемства Аляксандр Уладзіміравіч Чарноў адзначае, што ў агульным аб'ёме энергіі на выраб тоны цэменту 80 працэнтаў складае газ, астатняя частка прыпадае на электраэнергію і іншыя энерганосьбіты. Калі ўлічыць пастаянны рост кошту на газ, то ўвага да яго частковага ці поўнага замяшчэння безумоўна існуе. Як вядома, на ААТ «Краснасельскбудматэрыялы» ўжо дзейнічае ўстаноўка па спальванні старых аўтапакрышак для атрымання цеплавой энергіі.

— Мы выязджалі вывучаць вопыт спальвання аўтапакрышак у Літве, — кажа Аляксандр Уладзіміравіч. — Эканомія ад выкарыстання гэтага віду паліва існуе. Але і клопату па захаванні экалагічнай чысціні вытворчасці дадаецца таксама. Каб было зразумела: для тэхналогіі вытворчасці цэменту няважна што спальваць — драўніну, торф, вугаль, газ ці пакрышкі. Існуюць тэхнічныя рашэнні выкарыстання любога з гэтых энерганосьбітаў. Галоўнае тут не даніна модзе, не пагоня за таннай славай, а ўзважлівы няспешны падыход. Пакуль наш цэмент канкурэнтаздольны па цане, мы будзем выкарыстоўваць газ. Зразумела, што да пэўнай мяжы разам з коштам газу будзе расці і кошт самога цэменту.

Энергагаспадарка прадпрыемства даволі складаная, у ёй выкарыстоўваюцца ўсе прамысловыя віды энергіі. Абслугоўвае яе калектыў у паўтары сотні чалавек.

Не меншы штат і ў падначаленні галоўнага механіка Андрэя Віктаравіча Вашчылы. Спецыяліст ён малады, працуе на заводзе чатыры гады. Яго служба, як і служба галоўнага энергетыка, наўпрост уплывае на сабекошт прадукцыі. Перш за ўсё аператыўнасцю ў выкананні рамонтаў. Што тычыцца новай печы, то вывад яе на праектную магутнасць адбыўся ў штатным рэжыме. Зараз малады калектыў механікаў (толькі за апошнія гады ў яго ўліліся пяць выпускнікоў Магілёўскага машынабудаўнічага інстытута) працуе над яе абслугоўваннем, выконвае бягучы рамонт абсталявання.

Цяпер ВРУП «Крычаўцэментнашыфер» — зладжаная каманда, якая здольная скарыць не адну вытворчую вяршыню. Да вытворчых здзяйсненняў яна пастаянна дадае перамогі ў галіне якасці прадукцыі. Прадпрыемства пацвердзіла званне Лаўрэата прэміі Урада Рэспублікі Беларусь за дасягненні ў галіне якасці ў 2007 годзе. Такі поспех быў дасягнуты перш за ўсё дзякуючы якасці портландцэментаў: бездабавачнага ПЦ 500-Д0, з мінеральнымі дабаўкамі марак ПЦ 500-Д20 і ПЦ 400-Д20, шлакапортландцэменту ШПЦ 400, а таксама высокай якасці крычаўскага шыферу — лістоў азбестацэментавых плоскіх, не падвергнутых прэсаванай апрацоўцы, а таксама хвалевых неафарбаваных і пакрытых палімернымі пакрыццямі (апошнія карыстаюцца павышаным попытам з-за свайго выдатнага знешняга выгляду і высокай стойкасці). У лютым гэтага года прадпрыемства перамагло і ў галіновым конкурсе «На лепшае дасягненне ў будаўнічай галіне Рэспублікі Беларусь за 2007 год» у намінацыі «Арганізацыя года». Так высока была ацэнена праца прадпрыемства па павышэнні прафесійнага ўзроўню работнікаў, укараненні новых тэхналогій, эканоміі энергарэсурсаў і шэрагу іншых паказчыкаў, у тым ліку ўкараненні міжнародных стандартаў ISO 9000, 14000, 18000. У намінацыі «Прадукт года» Ганаровым дыпломам і Памятным знакам быў адзначаны портландцэмент з вапняком. Гэты высакаякасны будаўнічы матэрыял крычаўцы пачалі выраблять першымі ў краіне.

Сёння «Крычаўцэментнашыфер» з упэўненасцю глядзіць у будучыню. Да магчымай прыватызацыі тут адносяцца спакойна: хто б ні стаў уласнікам адкрытага акцыянернага таварыства, у якое плануецца пераўтварыць гэта дзяржаўнае прадпрыемства, добрасумленная праца заўсёды будзе запатрабаваная.

Віктар ХУРСІК.

УНН 700179598

НА ЗДЫМКАХ:

1. Галоўны інжынер Аляксандр БАРАВІКОЎ душой хварэе за будучыню прадпрыемства.
2. Галоўны энергетык прадпрыемства Аляксандр ЧАРНОЎ.
3. Галоўны механік прадпрыемства Андрэй ВАШЧЫЛА.
4. Багародзіца з Хрыстом — такая вывяа праявілася ў кар'еры Каменка. Супрацоўнікі расцэньваюць гэтую з'яву як добры знак. Раней на такіх месцах узводзілі храмы.
5. У заводскім музеі. Захавальнік гісторыі калектыву былы марскі афіцэр Аляксандр БАЛДОЎСКІ запатаваў у сваіх нарысах не адну рабочую біяграфію.

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, *e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by*, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.

http://www.zviazda.by
e-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.948 Індэкс 63850. Зак. № 4337. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12